PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 18 (2451) Год XLVIII | Беласток, 4 мая 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Укласціся з меншасцямі

Аляксандр Максімюк

Польшча ўсё не сфармулявала сваіх адносін да нацыянальных меншасцей. Народная Польшча праводзіла маральна няслушную, але з пункту погляду сваіх інтарэсаў вельмі паспяховую палітыку — трымала пад клапаном усё грамадства, не дапускаючы заіскрыцца міжнацыянальным сутыкам („можаш сабе быць добрым беларусам/ літоўцам/ украінцам/ ... абы толькі ты быў добрым палякам" — сцвярджаў нефармальны лозунг сакратароў парткамітэтаў). Сучаснае дзяржаўнае чынавенства здаецца быць пазбаўленым гэткіх ясных арыенціраў. Зусім ясная затое іншая акалічнасць — прыналежнасць краіны да еўрапейскага элітнага клуба прымушае яе ўкласціся са сваімі меншасцямі.

Тое ўзаемнае ўкладанне толькі пацвярджае, што няма ў ім адной думкі — дзяржава фінансава падтрымлівае культурныя мерапрыемствы меншасцей, а прытым разбаўляе кампактнасць меншаснага этнасу, насаджаючы тэрыторыю пунктамі памежнай аховы, у персанале якой часамі паўштату для мясцовай прыбіральшчыцы (у дэкларацыях жа мелі быць новыя месцы працы аўтахтоннаму насельніцтву), раз затарможвае ўзвядзенне нацыянальных сімвалаў (помнік закатаваным беларускім вазакам у Бельску-Падляшскім), іншым разам робіць з гэтага выбарчы спектакль (адкрыццё таго ж помніка напярэдадні самаўрадавых выбараў 2002 г.).

Нягледзячы на гэтую хісткасць узаемадачыненні рухаюцца наперад — польскі ўрад паслаў у 2002 годзе генеральнаму сакратару Рады Еўропы дзяржаўны рапарт аб выконванні Польшчай Рамачнай канвенцыі па ахове нацыянальных меншасцей, а 15 красавіка 2003 г. у Беласток прыехала група спецыялістаў Дарадчага камітэта Рамачнай канвенцыі пазнаёміцца з пунктам погляду меншасцей. У групу ўвайшлі: Атанасія Спіліпулу Акермарк (Athanasia Spilipoulou Akermark, першая намеснік старшыні Дарадчага камітэта), Лідзія Баста Флайнер (Lidija Basta Fleiner, сябра Дарадчага камітэта), Тоніо Алул (Tonio Ellul, таксама сябра) і Ален Шабле (Alain Chablais, ад Сакратарыята Рамачнай канвенцыі). Арганізатарам сустрэчы спецыялістаў з прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей была Ваяводская ўправа. Сама сустрэча, калі ўзяць пад увагу раней сказанае і агульную нявыкрышталізаванасць адносін урада да меншасцяў, была ані яўнай, ані засак-

[працяг ☞ 2]

Фота МІРЫ ЛУКШІЦ

Сын Лукошыкаў Якуб вярнуўся з Еўропы

У Еўропе аднолькавых шанцаў

Лукошык, „Верхняя Супрасль" ды малако

Міра Лукша

Уладзімір Лукошык разам з жонкай Лідай едуць па сына ў ваяводскі горад Беласток. Якуб, студэнт варшаўскай Галоўнай школы сельскай гаспадаркі, вяртаецца з еўрапейскай сталіцы. З Лондана. Ці будзе ён займацца тым, чым гарадоцкія бацькі ды пухлаўскія дзяды, значыць, гадоўляй малочных кароў, невядома. Летам разам з бацькам ды братамі Лукашом і Марцінам сядаюць на тры трактары, працуюць, загатаўляюць сена на сілас ды робяць іншае, чаго ў гаспадарцы, сярэдняй, на 114 гектарах, не бракуе. 26 гектараў гэта лес, 6,5 га — ворная зямля пад кукурузай, рэшта — сенажаць ды паша. На гэтым усім жывуць ды кормяцца 46 дойных кароў, 50 штук маладняку — цялушак маленькіх, малых ды перад зацяленнем. Усё жаночы пол. Калі заязджаем з Беластока ў Гарадок, на вуліцу Пяскі, якраз Юрорка выцелілася. Мокры бычэчак увесь заліты малодзівам. Праз 4-5 дзён адымуць яго ад маткі і пойдзе ён у свет. Такое жыццё — прадукцыя!

Уладзімір Лукошык, родам з Дзернякова, былы вучань бельскага педагагічнага ліцэя, выпускнік варшаўскай заатэхнікі, робіць тое, ад чаго пачынаў:

— Пасвіў малым я кароў ды авечак, настаўнічаў, быў кіраўніком СКРу, і ў свае трыццаць гадоў зноў стаў пасвіць.

Цесць планаваў заняцца таксама каровамі, у сваіх Пухлах. Уладзімір, тады ў кааператыве, намовіў яго з Нарваўскай перанесціся ў Гарадоцкую гміну, дзе ўсё на месцы. У 1978 г. пачалі будаваць абору. Калі канчалі, цесць сказаў: рабі што хочаш. У 1980 г. Уладзімір кінуў *панствовую* работу і заняўся гаспадаркай. Не прыйшоў на цесцеву — пачаў ад 5 гектараў, пераняў ад бацькоў, дакупіў ад людзей і з фондаў. Тыя фондаўскія палеткі ды лугі былі страшэнна запушчаныя, зарослыя карчамі. Давялося ўсё добраўпарадкаваць, меліяраваць па-сучаснаму, з навадненнем. Ад 1981 года абора была гатова (функцыянавала ад 1979 г.), у гаспадарцы быў і „апас" (бычкі), свінні, і коні, і куры. А ў 1994. рушыла сапраўдная прадукцыя малака. Давялося прытым тую старую, салідную абору разваліць, раздзяўбці (а будавалася яна „навечна!") і пачаць гаспадарыць іначай. Паставіць на гадоўлю малочных кароў чорна-белае пароды. Ад 13 сваіх кароў Уладзімір дайшоў да 46, з кожным годам павялічваючы адборны статак.

— Ёсць у нас рэкардсменкі. Па паказчыках відаць, якая чаго вартая, — гаспадар дастае тоўстую папку, у якой кожная карова мае свой пашпарт — з партрэтам злева, справа ўсяе фігуры, разам з усімі цяткамі ды латкамі, і з мызы ад фронту, з радаслоўнай — ад якіх маці ды бацькі, адкуль яны родам, можам пазнаёміцца з імёнамі нават каровіных бабы ды прабабы, таксама шляхетных. І запісана ўся „выдойнасць" — колькі літраў дае, скажам, тая Параска, унучка Пармы, якая дала надой у апошні год 8 180 літраў.

— Цяпер найдойваем паміж 250 — 300 тыс. літраў у год, — з задавальненнем кажа гаспадар і выцягвае часопіс, дзе ў спіску найлепшых пастаўшчыкоў малака ў Саколку зафіксаваны ён і ягоныя калегі з гміны і суседніх.

[працяг ☞ 3]

Бойся нас, Еўрасаюз ☞ 3

Я так разумнічаю ўжо не першы раз на калонках „Нівы" пра той ЕС. А як сам буду галасаваць? Пайду традыцыйна, як на выбары, у нядзельку, бо ў суботу ў мяне будзе яшчэ час выбрацца. Адзначу „так", хоць шмат у мяне сумніваў, якія выказваю таксама на старонках тыднёвіка маіх беларусаў. Пакуль што, іншага выйсця няма.

Нахабная рэклама ☞ 4

Апошнім часам у адным з беластоцкіх шпіталяў я знайшоў рэкламныя лістоўкі пахавальных фірмаў. Гэта і даволі лагічна, бо дзе як дзе, але ў шпіталі найбольш кандыдатаў на нябожчыкаў. Чалавек яшчэ пры жыцці можа выбраць сабе поўны пахавальны цырыманіял, дубовую, сасновую ці яловую труну, марку аўтамабіля на апошняе зямное падарожа.

Літаграфіі, гравюры і акварэлі ☞ 8

У Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы з 14 красавіка адкрыта выстаўка літаграфій, гравюр і акварэль беларускага мастака з Мінска Васіля Шаранговіча. Большасць літаграфій, гравюр і акварэляў, паказаных на выстаўцы, выкарыстаны як ілюстрацыі да творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа і Адама Міцкевіча.

Шум вечнай калыханкі ☞ 9

За бярозай распаложаны велікаватыя могілкі, на якіх у час першай сусветнай вайны пахавалі загінуўшых салдатаў: ад поўдня немцаў, а з поўначы рускіх. У міжваенны перыяд тых могілак ніхто не даглядаў. Калі насталі немцы, яны рашылі ўпарадкаваць могілкі. Рабілі гэта жыхары Арэхавіч.

Беларуская дзесяцігодка ў Орлі ☞ 10

Перад настаўнікамі мясцовага паходжання савецкія асветныя ўлады паставілі надта цяжкі абавязак: паведамілі, што калі яны на працягу паўгода не пройдуць з навучаннем свайго прадмета на беларускую мову, дык іх вызваляць з работы. Найхутчэй справіліся з гэтым Лея Юнгерман і Тадэвуш Врублеўскі, які шмат гадоў працаваў у беларускім асяроддзі.

Прыгода з банкаматам ☞ 11

Пайшлі мы паглядзець на гэты цуд і грошы атрымаць. Глядзім, а там чарга стаіць вялікая, большая як калісьці ў банку. Падышла жанчына, засунула картку ў банкамат, стала набіраць нумар, але спазнілася на пару секунд і банкамат картку з'еў і грошай не даў. Другі чалавек набраў нумар, кінуў картку, а банкамат напісаў: „Денег нет", і картку назад не аддаў.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Укласціся з меншасцямі

[1 ☞ працяг]
рэчанай (цяжка пранікнуць, чаму запрасілі Яўгена Вапу, а „Ніву” ці „Часопіс” абышлі ўвагай), удзел у ёй прадстаўнікі прэсы прымалі і адначасна не прымалі (закрыта для прэсы, але „Ніва” і меншасная праграма Радыё Беласток былі), ад сустрэчы можна спадзявацца вынікаў (будзе рапарт), але яны не ў сіле паўплываць на ўрад Польшчы (так сцвердзілі самі аўтары будучага дакумента).

У час сустрэчы выказаліся прадстаўнікі беларусаў, літоўцаў, расіян і татараў. Ірэна Гаспяровіч ад Супольнасці літоўцаў у Польшчы заявіла, што жыццё не такое ўжо і прыгожае, як тое прадстаўляецца ў дзяржаўным рапарце. Размяшчэнне пагранічнай аховы ў Пуньску, паводле яе, пярэчыць запісам Рамачнай канвенцыі, бо на самай справе ўяўляе крок, які мае на мэце парушыць нацыянальную структуру насельніцтва Пуньска. І. Гаспяровіч звярнула таксама ўвагу на закрыванне школ з літоўскай мовай па фінансавых прычынах. Думку І. Гаспяровіч падтрымаў старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства Ян Сычэўскі, які сказаў, што рапарт загладжаны і хутчэй уяўляе юрыдычны стан, а не рэальнае жыццё ў дэталях. Ён дадаў, што ў Польшчы ўжо трынаццаты год рыхтуецца і з-за недахопу палітычнай волі не можа прабіцца закон аб нацыянальных меншасцях. Старшыня Беларускага саюза Яўген Вапа звярнуў увагу, што ў Польшчы адказнасць за нацыянальныя меншасці сапхнута на няўрадавыя арганізацыі тых жа меншасцей — арганізацыі атрымліваюць датацыю на канкрэтныя мерапрыемствы, але не на штаты, і не на сядзібы. Уявіце сабе — аргументаваў ён, — што раптам польскім дамам культуры спыняецца датацыя на ўтрыманне іхніх сядзіб. Я. Вапа сказаў таксама, што гістарычныя назвы мясцовасцей, у якіх жывуць беларусы былі спольшчаны — цяпер мясцовая адміністрацыя палохае, што вяртанне да старых назваў (змена таблліц) можа адбыцца толькі за кошт саміх жыхароў. І ўрэшце, закончыў Я. Вапа, Польшча парушыла запіс Рамачнай канвенцыі, калі ў апошніх самаўрадавых выбарах так пераўфармавала акругі, што беларусы апынуліся ў меншасці. У гэтай справе афіцыйна пратэставаў дэпутат ад СЛД Яўген Чыквін. Тут голас узяла Т. Спіліпулу Акермарк, якая перапытала, ці пратэст напэўна спасылаўся на 16 артыкул Рамачнай канвенцыі, а потым дадала, што змена выбарчых акруг — „цяжкі закід”.

Дзяржаўны рапарт аб выконванні Польшчай Рамачнай канвенцыі па ахове нацыянальных меншасцей — рэч вартая чытання і замала рэкламаваная сярод саміх меншасцей. Знаходзіцца ён па адрасе http://www.mswia.gov.pl/pdf/raport_mn.pdf, Складаецца ён з шасці частак: 1) агульнай інфармацыі пра нацыянальныя меншасці (чыноўніцкі погляд на нас варты выключнай увагі, бо калі б не ўваход Польшчы ў Еўрасаюз, наўрад ці мелі б мы доступ да гэткіх рэсурсаў), 2) інфармацыі пра выконванне Польшчай Рамачнай канвенцыі — гэты раздзел можа таксама паслужыць як тэкст самой канвенцыі (тут цытуюцца яе артыкулы, пасля якіх ідзе ўрадавы каментарый), 3) інфармацыі пра органы і ўстановы, якія ў Польшчы займаюцца меншаснай палітыкай, 4) інфармацыі пра злачыннасць, 5) кароткага падсумавання, 6) дадатку, які змяшчае польскае заканадаўства ў дачыненні да нацыянальных меншасцей і дамовы Польшчы з краінамі-суседзямі.

Як і кожнае чыноўніцкае сачыненне, рапарт трэба чытаць крытычна — пішуць там, прыкладова, што прадстаўнікі беларускай меншасці засядаюць у польскім парламенце актуальнага склікання, але ў час сустрэчы са спецыялістамі Дарадчага камітэта Рамачнай канвенцыі па ахове нацыянальных меншасцей у Беластоку не было ніводнага парламентарыя, ні польскага, ні беларускага. Замалая справа?

Аляксандр Максімюк

Аб дыпломах беларускіх ВНУ

9 красавіка г.г. у Варшаве адбылася сустрэча пасла Рэспублікі Беларусь у Польшчы Паўла Латушкі з міністрам асветы і спорту Крыстынай Лыбацкай.

У ходзе размовы бакі абмеркавалі пытанні расшырэння беларуска-польскага супрацоўніцтва ў галіне асветы, маладзёжнага, асветнага, спартыўнага і турыстычнага абмену. Павел Латушка падкрэсліў зацікаўленасць беларускага боку ў далейшым развіцці плённага супрацоўніцтва паміж міністэрствамі асветы абедзвюх краін.

Значнае месца ў размове заняло абмеркаванне праблемы прызнання дыпломаў атрымання вышэйшай адукацыі ў ВНУ Беларусі ў сувязі з намерам Польшчы дэнансаваць Пражскую канвенцыю ад 7 ліпеня 1972 г. Гэтая праблема выклікае вялікую занепакоенасць беларускай нацыянальнай меншасці, шматлікія прадстаўнікі якой вучыліся і вучацца ў вышэйшых навучальных установах Беларусі.

Крыстына Лыбацка выказалася ў карысць хутчэйшага заключэння адпаведнага двухбаковага пагаднення, якое рэгулявала б прызнанне дакументаў аб адукацыі.

Бакі выказалі зацікаўленасць у наладжванні кантактаў па рэалізацыі сумесных маладзёжных праграм і праектаў і ва ўстанаўленні кантактаў у галіне спорту і турызму.

У ходзе размовы была дасягнута дамоўленасць аб правядзенні ў бліжэйшы час у Варшаве сустрэчы міністраў адукацыі абедзвюх краін.

www.mfa.gov.by

Некамуністычныя суботнікі

Калісьці ледзьве не самым галоўным вынікам вызвалення працы ў Савецкім Саюзе лічыліся суботнікі. Называліся яны „камуністычныя”. Распачатыя з прыходам да ўлады бальшавікоў, мелі не толькі эканамічны, але і палітычна-ідэалагічны змест. Сапраўды, падаецца вельмі прывабным, калі людзі працуюць толькі дзеля свайго грамадства, не атрымліваючы за гэта ні капейкі. Але з цягам часу, камуністычныя суботнікі ператварыліся ў звычайны рытуал па ўборцы вуліц і пасадцы дрэў і ніхто не казаў пра вялікія грошы атрыманыя дзяржавай, што выкарыстала рабскую, па сутнасці, працу сваіх грамадзян. Неяк сароміліся. У сучаснай Беларусі многае крыху па-іншаму.

Ужо некалькі гадоў запар беларускае насельніцтва заклікаецца ўладамі выйсці і папрацаваць бясплатна на карысць той ці іншай мэты. І не важна — ці то патрэба ў паліве на сяўбу калгасам, ці то неабходнасць у хутчэйшай пабудове Нацыянальнай бібліятэкі. Эканамічны сэнс бясплатнага дня працы бачыцца ў атрыманні пэўнай колькасці грошай. Пра гэта гаворыцца, у адрозненні ад савецкіх часоў, прама і бессаромна. У наёмных работнікаў нават ёсць выбар — яны могуць і не выходзіць з мяцёлкай на вуліцу, працуючы замест камунальных службаў, а папросту пералічыць свой дзённы заробак на той рахунак, куды, нібыта, пойдуць грошы ад суботніка. Пры гэтым людзям тлумачыцца, што дармовая праца на карысць агульнадзяржаўных патрэб ледзьве не самая высакародная рэч.

Ужо неаднойчы казалася аб гаротным стане беларускай сельскай гаспадаркі, аб затрымках заробку на прадпрыемствах і ва ўстановах, аб растучым беспрацоўі і іншых „дасягненнях” цяперашняга гаспадарання ў Беларусі. Патрэба ў эканамічных рэформах у краіне зразумела кожнаму думаючаму чалавеку, але толькі не яе кіраўніцтву. Бо як інакш патлумачыць рэанімаванне „дабраахвотна-прымусовых” суботнікаў, гэтай уласцівай камуністычным часам з'явы?

Варта адзначыць, што суботнікі могуць праводзіцца і не адзін раз у год. Але апошні, што адбыўся 19 красавіка, меў на мэце прыцягненне сродкаў на будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі, што ўзводзіцца ў Мінску і мусіць стаць самым вялікім сховішчам ведаў у краіне. Аддаць свае кроўна зароблены грошы на такую высакародную патрэбу адмовіцца далёка не кожны беларускі грамадзянін, але, як паказвае жыццё, нават такую добрую справу можна ператварыць у непрыемны прымус. Бо сённяшняя беларуская недэмакратычная рэчаіснасць не спрыяе сапраўднаму выяўленню таго ці іншага жадання, а невялікія заробкі не дазваляюць людзям выдаткоўваць грошы на мноства іхніх уласных патрэб. Больш таго, непрыняцё ўдзелу ў рабскай працы можа выклікаць непрыемнасці ад кіраўніцтва, якое падначаленае выканаўчай уладзе і мусіць адрапартаваць аб удала праведзеным суботніку. Пералічваць грошы павінны і прыватныя суб'екты гаспадарання, бо адмова нясе стварэнне новых праблем у стасунках з мясцовай прэзідэнцкай вертыкаллю.

Нельга казаць, што ўсіх у Беларусі задавальняе такі стан рэчаў, калі забароненая Канстытуцыяй прымусовая бясплатная праца існуе, дзякуючы штучна прыдуманым ідэалагічным пастулатам аб адсутнасці ў грамадстве „прагі нажывы”. Свабодныя прафсаюзы і праваабарончая арганізацыя праз суды змагаюцца за дадзенае законам права атрымліваць грошы за сваю працу і звяртаюцца да міжнародных структур, кшталту Міжнароднай арганізацыі працы, даць ацэнку такім дзеянням улад.

Зразумела, да ўсебеларускага асуджэння такой неканстытуцыйнай з'явы яшчэ далёка, аднак невялікі зрух ёсць. Заклікі да ўдзелу ў суботніку сёлета мелі ў сабе падкрэсленае ўзгадванне аб добраахвотнасці.

Ну а як доўга будуць існаваць у Беларусі некамуністычныя прымусовыя суботнікі залежыць больш ад тых, хто на іх выходзіць, пагаджаючыся на прымусовую знявагу сваёй працы і таптанне законных правоў.

Уладзімір Лапцэвіч

Фонд Форда падтрымлівае праекты беларускай меншасці

Амаль сорак праектаў, якія ставяць за мэту захаванне традыцыі і культуры ды падтрымку іншых ініцыятыў у карысць беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, атрымалі фінансавую дапамогу ад Фонду Форда.

— Трэці выпуск конкурсу „Малыя гранты” арганізаваў Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь з сядзібай у Беластоку. Аўтары праектаў атрымаюць агулам каля 120 тысяч злотых, — паведаміў 17 красавіка праграмны дырэктар Цэнтра Яўген Вапа.

Хадайнічаць аб датацыі для сваіх праектаў маглі няўрадавыя арганізацыі, школы і іншыя ўстановы, якія працуюць у карысць беларускай нацыянальнай меншасці. Камісія аддавала перавагу адукацыйным, выдавецкім, культурным і самаўрадавым праектам.

Сёлета конкурсная камісія разгледзела 81 праект на агульную суму больш за 500 тысяч зл. Як адзначыў Яўген Вапа, трэці выпуск конкурсу паказаў, якія патрэбы мае беларускае асяроддзе ў галіне адукацыі і культуры. Большасць падтрыманых датацыямі праектаў рэалізуюць школы, якія праяўляюць самую вялікую актыўнасць: арганізуюць школьныя музеі, конкурсы і адукацыйныя мерапрыемствы.

У сярэднім велічыня гранта вагаецца ў межах 2-3 тысяч зл. Найбольш, бо 9 тыс. зл. атрымаў Беларускі самаўрадавы форум у РП, які рыхтуе цыкл адукацыйных сустрэч пад лозунгам „Беларускія самаўрадавыя чацвяргі”, а таксама суполка „Villa Sokrates”, якая арганізуе міжнародныя сустрэчы „Беларускі трыялог”.

Былі таксама прызначаны грошы на візіт у Польшчу таленавітых дзяцей з Беларусі і на народныя ўборы беларускім калектывам. Дзякуючы грантам ад Фонду Форда будуць выдадзены важныя для нацыянальнай і рэлігійнай самасвядомасці беларусаў кнігі ды аўдыёкасеты музычных калектываў.

Паводле www.bialorus.pl

Вачыма паляка

Бойся нас, Еўрасаюз

Кажу вам, гэта не мы павінны так баяцца Еўрасаюза, але еўрасаюзныя грамадствы не без падстаў могуць нас апасацца. Мы несвядомыя, якія адрачэнні ў першыя гады пасля ўваходу ў ЕС нас чакаюць. Больш у сродках масавай інфармацыі і ў час еўрасаюзных сустрэч можна даведацца аб карысцях, якія з гэтага вынікаюць. Ужо ўвогуле не чуваць пра боязь з таго боку. А, на маю думку, аб'яднаная Еўропа мае чаго баяцца. Да мая будучага года няшмат у Польшчы зменіцца. Далучымся да іх з нізкімі эканамічна-гаспадарчымі паказчыкамі, беспрацоўем, але, і што найважнейшае, з сармацкім пачуццём этычных каштоўнасцей, перакананнем ад вякоў аб уласнай асаблівасці, а затым — з няўмеласцю зносіцца з „іншымі".

Вынікі прапагандавага дастасоўвання Польшчы да структур, патрабаванняў і г.д. ЕС зводзяцца адно да радасці з завяршэння капенгагенскіх перамоў і падпісання Уваходнага трактата ў Афінах ды акцый заахвочваючых да ўдзелу ў рэферэндуме 7 і 8 чэрвеня. Не хапае г.зв. „арганічнай працы", якую вядуць перш за ўсё няўрадавыя арганізацыі, якая падрыхтоўвае да пашырэння гэтага супольнага дому (еўрасаюзнай Польшчы) на новых квадрантаў, якія не заўсёды жывуць па прынцыпах, па якіх мы хацелі б. Не значыць гэта, вядома, што мы мусім вырачыся ўсіх грамадскіх ці дзяржаўна-нацыянальных канонаў, пачаць праз сілу ўва ўсім гэтым прытварацца. Пара, аднак, прывыкнуць хоць бы да таго, што гаворачыя іншай мовай, людзі іншага колеру скуры, іншага веравызнання, не ўспамінаючы ўжо пра іншыя іншасці, змогуць прахаджвацца па нашых вуліцах, чакаючы задавальнення сваіх патрэб, якія вынікаюць з іхнай самай рознай прыналежнасці. Таксама і ў Беластоку.

Не магу зразумець у апошні час гэтага ўсяго шуму наўкол еўрасаюзнага рэферэндуму. Дыскусіі, ці мае ён праводзіцца адзін ці два дні, і заявы Лешка Мілера, што ўрад пойдзе ў адстаўку, калі прыме ў ім удзел менш чым 50% грамадства, а ўжо гарантавана пагалоўна адставіцца, калі большасць галасуючых скажа „не". Па-першае, славянам у гэтай частцы Еўропы (здаецца, не толькі палякам) чужая пагаворка „не адкладвай усяго на апошнюю хвіліну". Думаю, аднак, што шмат каму блізкі лозунг, вядомы з вопыту „яшчэ паспею". Так, вось, і мне здаецца, што ў суботу 7 чэрвеня шмат хто з нас, хто вырашыць пайсці на рэферэндум, скажа сабе: „Паспею яшчэ заўтра". Заўтра скажа: „А мне не хочацца" ды дадасць: „І так жа ж парламент вырашыць за мяне, нават калі ў рэферэндуме верх возьмуць еўраскептыкі". Дарэчы, пасля рашэння аб двухдзённым галасаванні цяжка будзе здзіўляцца адміністрацыі прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, што ён у сябе праводзіць выбары тыдзень. А прэм'ер Лешак Мілер, ставячы ў залежнасць адыход урада ад вынікаў рэферэндуму, быццам шантажыруе свой адданы, верны электарат. І той, пэўна, прагаласуе згодна з урадавымі пажаданнямі. У такім, аднак, падыходзе, адно небяспечнае, што тыя, хто галасаваў на гэтую кааліцыю ў апошніх выбарах, а цяпер, згодна з апытаннямі грамадскай думкі, выказваюць сваё назадавальненне сітуацыяй у краіне і СЛД, і могуць прагаласаваць толькі для таго, каб прэм'ер меў нагоду выканаць сваё абяцанне.

Пры нагодзе дэбаты якая датычыла рэферэндуму, міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, выказваючыся за двухдзённым тэрмінам, заклікаў будучых членаў акружных рэферэндумных камісій, каб дабравольна зракліся дыет за другі дзень галасавання. Паменшыла б гэта, на яго думку, кошт мерапрыемства. Пераконваў ён (прачытаў я аб тым у сервісе Польскага прэсавага агенцтва), што кожны грамадзянін у такой важнай справе можа парабіць адзін дзень дарма для дабра краіны. Прагучала гэта як, вядомы з часоў ПНР, заклік да грамадскага пачыну. Тым часам мая суседка спецыяльна зайшла да мяне з просьбай, каб я памог ёй старацца прыняць удзел у працах камісіі. Працавала ўжо яна (выбрана ў жараб'ёўцы) у выбарчай камісіі ў час апошніх самаўрадавых выбараў, ад камітэта, з якім быў я звязаны. І не цікавіць яе цяпер нейкае абстрактнае „дабро краіны", а каб зарабіць гэтых 200 ці 250 злотых. Ужо некалькі гадоў яна беспрацоўная, без правоў на сацыяльную ўспамогу, з шасцігадовай дачкой, на ўтрыманні маці-пенсіянеркі.

— Для дабра краіны то я хацела б знайсці пастаянную працу, — адказала.

Ну, так вось. Ці ў Польшчы ў Еўрасаюзе будзе ёй лягчэй?

* * *

Я так разумнічаю ўжо не першы раз на калонках „Нівы" пра той ЕС. А як сам буду галасаваць? Пайду традыцыйна, як на выбары, у нядзельку, бо ў суботу ў мяне будзе яшчэ час выбрацца. Адзначу „так", хоць шмат у мяне сумніваў, якія выказваю таксама на старонках тыднёвіка маіх беларусаў. Пакуль што, іншага выйсця няма. Значыць, ёсць: магчымасць тушыцца ў кулешы пад соусам *a lá polonaise*.

Мацей Халадоўскі

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Параска, Парма і Пума — рэкардсменкі ў надоях

Лукошык, „Верхняя Супрасль" ды малако

[1 ☞ працяг]

— Нічога ж не аплачваецца тым, хто жыве з гаспадаркі, — паўтараю паўсюдны лозунг тутэйшых.

— Сабралася „Верхняя Супрасль",

гэта значыць, дзесяцёх адважных гадоўцаў малочных кароў. У 1994 г., калі ўпала беластоцкая фірма „Mitex", нам плацілі вельмі мала за малако, — кажа У. Лукошык. — Ну і сабраліся мы ў купу, і рашылі перарабіць гаспадаркі. Прыстроілі ўмяшчальні-халадзільні, з якіх адбіраюць малако проста з гаспадарак. Уклалі мы вельмі, вельмі шмат працы, каб вышэйшая была якасць малака. І ў ледзь не два разы падаражала наша малако. Наш **кааператыў прадуцэнтаў малака „Верхняя Супрасль"** гэта была спачатку жменька людзей — з Гарадка, Глейска, Пянькоў, Кабылянкі, Лясанкі, Новай Волі, Юшкавага Груда. У наступным годзе дайшлі да нас гаспадары з Белявіч, Таніцы, Падазеран. Наладзілі мы сувязь з галандскім фондам з Туросні, і тады нас стала 50-60 гаспадароў. І, вось, бачыце, які пачатак быў — пару гаспадароў рашылі выдаць грошы, якіх не мелі, — бо хто мае запас у гаспадарцы? — пабралі пазыкі, нават вялікія (а тады не было ведамственнага крэдытавання), далі шмат працы, і вынік маем такі, што ў нашых гмінах больш за 70 гаспадароў, якія ў нашай суполцы займаюцца гадоўляй малочных кароў. Дарога ясная, вядома, што рабіць, але і ўмець трэба; не заўсёды выйдзе ўсё выдатна. Мой калега, у якога кароў у тры разы больш, дае мала больш малака ад маіх 46 кароў.

У спіску найлепшых пастаўшчыкоў малака ў кааператыў SOMLEK у Саколцы з дзесяцёх шасцёх — з „Верхняй Супраслі". Веслаў Дзіткоўскі з Валіл — 333 408 літраў, Рыгор Карпюк са Страшава — 318 741 л., Уладзімір Лукошык з Гарадка — 278 917 л., Вечаслаў Кардаш з Глейска — 237 997 л., Тэрэза Свяржэўская з Новай Волі — 218 325 л., Крыстафор Пяскоўскі з Пянькоў — 212 325 літраў... Каля 40 прац. малака ў кааператыве SOMLEK — ад „збёрнікаўцаў", малако высокай якасці, задавольвае еўрасаюзныя нормы. Прадуцэнты з „Верхняй Супраслі" пастаўляюць малако таксама і ў сямятыцкі POLSER.

— Мы і Еўрасаюз? — не здзіўляецца У. Лукошык. — Я вырабляю добрае малако і буду гэта рабіць далей. Бядуюць нашы гаспадары, што яны нас сваімі таварамі зальюць. Але, па эканамічнаму разліку, нашы людзі будуць купляць нашы сыры ды йагурты. Мы асуджаны на сваю прадукцыю. І мае фінансы (а такіх гаспадароў у Польшчы, на жаль, будзе толькі з 3%) ад гэтага не паправяцца ды і не пагоршацца. Ну, можа дзякуючы таму, што ўрад прыняў спрошчаную сістэму даплат да сельскай гаспадаркі (калі б у 100%, дык я меў бы даплату толькі да 6,5 га, на якіх вырошчваю кукурузу, а няма датацый на малочную прадукцыю, вырошчванне напр. бульбы і цукровых буракоў), дапамогу і прыбытак буду мець не толькі я, але і ўсё Падляшша, якое з усяе Польшчы найбольш трымаецца на малацэ, на зялёных угоддзях.

Ад Пянькоў, Меляшкоў, аж да Падазеран, пад Калітнік, Азяблы, Кабылянку, Новую Волю, цягнуцца зялёныя пашы і лугі. Куды ні глянь, расселіся гаспадары з „Верхняй Супраслі", гадуюць ды даюць кароў, пастаўляючы смачнае ды чыстае малако, зарабляюць грошы. Гаспадары на сваёй зямлі, якім ні Еўропа, ні нічога іншае — не страшнае.

Міра Лукша

7 конкурснае пытанне

Як называецца кааператыў прадуцэнтаў малака, да якога належыць герой рэпартажу Уладзімір Лукошык?

Адказ: .....

Імя і прозвішча: .....

Адрас: .....

(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 11 мая 2003 г.)

Узнагароды...

... за правільны адказ на ***4-яе конкурснае пытанне*** атрымоўваюць: **Лукаш Кастэцкі** і **Пётр Яноўскі** з Бельска-Падляшскага ды **Барбара Якубюк** з Гайнаўкі.

У Еўропе аднолькавых шанцаў

У рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў" друкуем чарговы тэкст з цыкла 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да артыкула прыкладзена конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жараб'ёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец праекта — галоўнага прызу: набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з'яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

Projekt wydawniczy zrealizowano przy współpracy z Urzędem Komitetu Integracji Europejskiej w ramach konkursu otwartego dla mediów-2003.

Нахабная рэклама

Разам з капіталізмам прыйшла да нас — сацыялістычнага па менталітэце грамадства — рэклама тавараў і паслуг, якіх мы непадрыхтаваныя купляць нават тады, калі маем грошы. У паштовай скрынцы кожнага дня знаходжу шмат каляровых лісткоў, на якіх рэкламуюцца прадукты з падвойнымі цэнамі. Першая — надта вялікая, другая, дзякуючы ласкавасці прадаўца, часам меншая напалову. Па электроннай пошце кожнага дня нехта прапануе хуткі і танны заробак, амаль дармовую экскурсію ці адпачынак у экзатычных краінах, а Кася, Лаліта, Эвеліна ці іншая Анджэліка запрашаюць на сустрэчу, якой, гарантуюць, не забыць да канца сваіх дзён.

Апошнім часам у адным з беластоцкіх шпіталяў я знайшоў рэкламныя лістоўкі пахавальных фірмаў. Гэта і даволі лагічна, бо дзе як дзе, але ў шпіталі найбольш кандыдатаў на нябожчыкаў. Чалавек яшчэ пры жыцці можа выбраць сабе поўны пахавальны цырыманіял, дубовую, сасновую ці яловую труну, марку аўтамабіля на апошняе зямное падарожжа.

У тэлебачанні, каб дачакацца прагнозу надвор'я, трэба выслухаць якія цукеркі любіў у маладосці дзед Станіслаў і чаму раіць ён сваім унукам смактаць іх яшчэ да першага снедання. Гаспадыня хваліць пральны парашок, якім адмыла непраўдападобна брудныя кашулі мужа і дарастаючых дзяцей. Прыгожыя і маладыя дзяўчаты рэкламуюць касметыку супраць маршчын, а гледачу можа здасца, што іх прыгажосць з'яўляецца вынікам прымянення дэманстраванага прадукта. Актрыса Ганка Бяліцкая пераконвае нас, што „віловіт" верне дзевяностагадоваму чалавеку памяць і жыццяздольнасць дваццацігадовага маладзёна. Падобны лекавы сродак заахвочвае купляць Пётр Франчэўскі. Шакалад ці малако папулярнай фірмы заахвочвае набываць вядомы спартсмен Адам Малыш. Ніхто з вялікіх людзей, што прапануюць нам купляць прадукты, якіх, магчыма, яны самі не трымалі ў руках, не гаворыць тэлегледачам за якую суму прыкідваюцца клоунамі.

Найбольш нахабна рэкламуюць свае прадукты супермаркеты — вялікія гандлёвыя прадпрыемствы. Народ сапраўды масава карыстаецца гэтай формай продажу, не ўсведамляючы сабе, што купляе найдаражэйшыя прадукты ў горадзе. Калі нехта прапануе каўбасу за 4 злоты, тады ўзнікае пытанне чым яна начынена. Пытанне такое тым больш абгрунтаванае, што 4 злоты прыблізна плацяць за кілаграм жыўнасці. Па дарозе ў краму зарабляюць вытворцы каўбасы, адводзіцца некалькі падаткаў, пасля даходзяць гандлёвая нацэнка і чарговыя падаткі. Еўрапейская норма дапускае, што ў кілаграме мяса можа быць нават 60 працэнтаў масы хімічнага паходжання. Такі падобны на мяса прадукт можна набыць за 15 злотых. Што знаходзіцца ў каўбасках па 4 злоты за кілаграм, лепей не здагадвацца. Але людзі купляюць, таксама як боты за 20 злотых ці паўтаралітровую бутэльку кока-колы за 30 грошаў. Інфармацыю пра неверагодна нізкія цэны кожнага вечара вешаюць на клямку дзвярэй маладыя людзі. Дзеці, калі чытаюць, што новы тэлевізар можна набыць у краме за 300 злотых, патрабуюць неадкладна ехаць у магазін, каб суседзі не апярэдзілі і тавар не раскупілі.

У гатэлях у Варшаве пры ўваходзе ў пакой ляжаць нумары тэлефонаў і спіс паслуг, якія гатовы выканаць усялякія Лаліткі. Літаратура, якую далучаюць да практычных інфармацый, пераконвае, што ноч без прапанаваных паслуг трэба лічыць змарнаванай. У Беларусі такія паслугі прапануюць невядомыя сябры па тэлефоне, а на Украіне пры ўваходзе ў гатэль пазнаёміцца са сваячкамі заахвочвае пажылая жанчына.

Раней напаўкрымінальнае жульё рассылала ў прыгожых канвертах лістоўкі з інфармацыяй, што атрымальнік з'яўляецца вельмі шчаслівым чалавекам і выйграў 10 ці 20 тысяч злотых, але каб атрымаць пазначаную суму, павінен ён набыць прадукт гэтай фірмы за 200 ці 300 злотых. Праз некалькі дзён шчаслівец атрымліваў пластмасавую цацку, а выйграных 10 тысяч ніхто не хацеў яму выплаціць. Паштовы адрас фірмы, якая абяцала даваць дарма грошы, звычайна расплываўся ў нябыце. Але пакрыўджанымі ў гэтым выпадку былі толькі тыя, што хацелі мець грошы без працы і ўласнай актыўнасці.

Найбольш амаральным ашуканствам з'яўляецца рэклама курсаў для беспрацоўных, якія маюць адкрыць дарогу да атракцыйнай працы. Курсы, зразумела, бываюць толькі платныя. Людзі ў бязвыхаднай сітуацыі пазычаюць грошы на адукацыю, якая мае адмяніць іх лёс. Найчасцей пародыя абучэння новай прафесіі канчаецца ўручэннем прыгожага дыплома, які на камп'ютэрным прынтэры можа аддрукаваць кожная сакратарка. Такі дакумент найчасцей становіцца помнікам наіўнасці яго ўладальніка.

Яўген Мірановіч

Надышла эпоха паветра

Хрысціянская дэмакратыя — партыя, заснаваная Лехам Валэнсам — абапіраецца на фундаментальныя прынцыпы шырока разуметага хрысціянства. Ёсць у ёй месца не толькі для католікаў, але і для прадстаўнікоў іншых веравызнанняў, таксама і праваслаўных. Да такіх высноў можна дайсці пасля сустрэч былога прэзідэнта РП у Беластоку.

Лех Валэнса прыбыў у сталіцу Падляшскага ваяводства м.інш. па запрашэнні Праваслаўнага брацтва св.св. Кірылы і Мяфодзія. Сустрэўся галоўным чынам з моладдзю Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі і Універсітэта ў Беластоку. Хоць, згодна з заявай, Лех Валэнса меў гаварыць аб ролі хрысціянскай дэмакратыі і ўваходзе Польшчы ў Еўрасаюз, узялі верх ужо вядомыя ягоныя думкі на тэму рэарганізацыі еўрапейскіх і сусветных структур, такіх як ААН ці НАТА. Паўтараў ён, што ААН павінна пераўтварыцца ў глабальны парламент, Савет Бяспекі — у глабальны ўрад, а НАТА ў міністэрства глабальнай абароны.

Сустрэчы з тлумамі моладзі ў актавай зале гістарычна-сацыялагічнага факультэта пачаў ён ад апраўдвання сябе з часу свае прэзідэнтуры:

— Тое, што вы пра мне ў той час чулі, гэта ў 95 працэнтах брыдкія справы. Але гэта вынік палітычнай барацьбы.

Былы прэзідэнт падкрэсліў, што крочым мы ўжо новай эпохай — паветра (хуткіх самалётаў, Інтэрнэту, мабільных тэлефонаў), пакідаючы за сабою эпоху зямлі, з родам з дваццатага стагоддзя заваёвамі зямлі, зменамі межаў.

— У эпоху паветра перасоўванне межаў не мае ніякага сэнсу.

Аднак, найважнейшае — будаванне новых еўрапейскіх і сусветных структур:

— Трэба ісці ў бок будавання Аб'яднаных Штатаў Еўропы.

На думку Л. Валэнсы, будучыя глабальныя ўзброеныя сілы павінны займацца безадкладным вырашаннем праяў і канфліктаў звязаных з антысемітызмам, расізмам і этнічнымі чысткамі.

Не абышлося без адказаў на пытанні моладзі, якія датычылі бягучых спраў.

Прэзідэнцтва Аляксандра Кваснеўскага пракаментаваў гэтак:

— Адняў ён Польшчы 5 хвілін.

А аб польскіх палітыках:

— Думаюць яны акругамі і кадэнцыямі, *тэлевізіяй* без уласнай *візіі*.

І далей аб парламенцкіх правых партыях:

— ПіСы, Платформы, невядома што ўсё такое.

У час ранейшых сустрэч прадбачваў:

— Прыспешаныя парламенцкія выбары не кончаць палітычнага крызісу ў Польшчы. Калі б выйграла LPR або Самаабарона, гэта была б трагедыя.

Ва універсітэце, у палове гадзіннай сустрэчы, адзін маладзён з залы крыкнуў:

— Вы нам гаворыце тое ж самае, што Кваснеўскі ў 1995 годзе, жыд той!

Лех Валэнса рэагаваў:

— Слова жыд — не мая хвароба. Людзі — прыстойныя, або не. І з мяне жыда рабілі, хоць я ім не ёсць. Калі б я ім быў, напэўна адчуваў бы гонар за свой народ.

Не хацеў адказваць на пытанне, хто быў бы найлепшым у будучыні прэзідэнтам Польшчы. Калі заклікаў моладзь да выбару найлепшага варыянта змен у Польшчы і ў свеце, быццам мімаходам паказаў на стаяўшага поруч у элегантным касцюме, поўнага зразумення для бацькавых ідэй, наймалодшага Валэнсавіча, які спадарожнічаў бацьку ўвесь час на Беласточчыне.

Мацей Халадоўскі

Побыт жыхароў Арлянскай гміны

Арлянская гміна, распаложаная на разнавідных глебах, мае тыпова сельскі характар. З земляробства жыве тут, аднак, мала людзей. Нямногія ўтрымоўваюцца і з пазасельскагаспадарчай дзейнасці. У гміне вялікае беспрацоўе.

Арлянская гміна займае плошчу 170 квадратных кіламетраў у паўднёва-ўсходняй частцы Бельскага павета. У 22 салэцтвах, якія ахопліваюць 28 вёсак, у палове мінулага года пражывала 3 760 асоб, у большасці пажылых людзей, пенсіянераў. Лік жыхароў з кожным годам меншае.

Земляробства

У гміне мала гаспадарак, якія займаюцца раслінаводствам і жывёлаводствам. Адсутнічаюць спецыялістычныя фермы гадоўлі быдла, свіней і авечак. Ад некалькіх гадоў у гміне няма пункта скупкі быдла і свіней. Такая сітуацыя з'яўляецца вынікам значнага абмежавання жывёлагадоўлі сялянамі; з 1998 года яна паменшала на 29%. Лік жывёлагадоўчых гаспадарак паменшаў за той час на 41%. Напрыклад, у Кашалях лік гаспадарак паменшаў з 30 да 15, а лік быдла з 145 да 96 штук.

Нязначна пабольшаў лік гаспадарак, з якіх непасрэдна забіраецца малако; сёння іх каля дваццаці. Ёсць шанс на рост гэтага ліку, але, бадай, не будзе іх больш чым 25. Важнай, усё яшчэ нявырашанай гміннымі ўладамі справай, з'яўляецца арганізацыя сістэмы утылізацыі падла. Да мінулага года шмат дакучалі бяздомныя сабакі, якія загрызалі быдла ў полі, прычыняючы страты і так небагатым сялянам. Многім земляробам не хапае грошай для аплаты і пенсіянерскай страхоўкі, і падаткаў у гмінную касу. У цэлай гміне цяжка было б далічыцца пяцідзесяці перспектыўных земляробаў. А паводле сельскагаспадарчага перапісу з 1996 года ў Арлянскай гміне з земляробства на сваёй гаспадарцы ўтрымоўвалася 899 асоб.

Пазасельскагаспадарчая дзейнасць

На тэрыторыі Арлянскай гміны дзейнічаюць гаспадарчыя суб'екты ў наступных галінах: транспартныя паслугі, аўтарамонтныя майстэрні, будаўнічыя, металаапрацоўчыя, бетонаробчыя, электрамантажныя, цяслярскія, сталярскія, гандлёвыя, дрэваапрацовачныя, саламянай і ракітнай вытворчасці, водапастаўчыя, гастранамічныя, кафлевытворчыя, кнігаводчыя, страхавальныя, арганізацыі курсаў, лесанаглядныя, ветэрынарныя і іншыя.

Да большых прадпрыемстваў у гміне можна залічыць Гмінны кааператыў „Сялянская самадапамога", млын „Арлянка", кандытарскую „Карына", водапастаўчую „Белавежскія воды" (у Аляксах), рамонтнае прадпрыемства Андрэя Куптэля, вытворча-гандлёвае вырабаў з драўніны і ракіты, сельскапаслуговае „Антанова", транспартнае Ежы Шыманскага і інш.

У 2000 годзе па-за гаспадараннем на ўласнай зямлі працавалі ў гміне 234 асобы, а з іх ліку больш за 60% у паслугах.

Беспрацоўе

З параўнання даных за апошнія пяць гадоў відаць, што лік беспрацоўных у гміне расце. У 1997 годзе было зафіксавана 175 беспрацоўных, у 2000 — 204, у 2001 — 213, а ў палове мінулага года — 189. Выклікае здзіўленне, што да 1999 года ў ліку беспрацоўных было па 17-20 землеўладальнікаў, у 2000 годзе ніводзін, а ў 2001 годзе — двух. Беспрацоўе, галоўным чынам, кранае неадукаваных асоб з кароткім працоўным стажам, асабліва жанчын ад 18 да 34 гадоў ды мужчын ад 25 да 54 гадоў.

* * *

Адмоўнай прыметай вясковых гмін з'яўляецца малая прыстасавальнасць астаўшыхся без працы людзей да новых эканамічных абставін. Шансам развіцця з'яўляецца рэструктурызацыя сельскай гаспадаркі, што створыць магчымасць — пры дапамозе вонкавых фінансавых крыніц — рыхтаваць працоўныя месцы ў пазаземляробчай вытворчасці і паслугах.

Міхал Мінцэвіч

Літаратурна-мастацкая старонка № 517

Міхась Андрасюк

Смала

Як з ночы вылузваецца дзень, як пасля зімы прыходзіць лета, так, пасля нашай хаатычнай зямной мітусні, прыспее час бестурботнай вандроўкі ў райскія нівы, а калі не надта хто спраўляўся, калі любіў крадком нырнуць у грэшныя хвалі сумнявання, або раскошы, тады спадзяецца хай на бясконцае сноўданне пякельнымі, смалістымі бездарожкамі. Бо ўсё ў жыцці мяркуецца за канкрэтную цану. І дарэмшчынай прыжытая радасць, і павярхоўна аплачаны смутак, усё яно пішацца ў раней прадбачаныя рубрыкі. А сочаць за чалавечымі справамі незлічоныя батальёны нябесных, добрасумленных чыноўнікаў. Як казала мая бабка Сонька: „А куды там нашым, магістрацкім да гэтых зазямных. Усё ў іхніх руках".

Не намагайцеся тады быць прарокамі на сваёй вуліцы.

А аднойчы бабка Сонька сказала: „А хай цябе пекла каўкне". І прамовіла такія словы якраз у той год, калі праваслаўнае Велікоднае свята прыйшло яшчэ да Юрыя, і калі ў Вялікую Пятніцу ступалі мы ў царкву, каб там, у смутку і цярпенні аб'яднацца з іншымі людзьмі, ды чакаць цуд што пераможа зло. А насустрач нам маршыраваў дзядзя Ваня. У борце ягонага пінжака чырванеў вялікі бант, твар святлеў ад бязмежнай радасці: ішоў жа дзядзя Ваня адзначаць перамогу заўтрашняга свету над учарашнім.

Раніца стаяла сонечная, узлазіла на бярозы першая зелень, з-пад зямлі вытыркалася на новае жыццё адвечная трава. У такія хвіліны хочацца чалавеку жыць і спяваць. І дзядзя Ваня падпяваў радасную, па-рэвалюцыйнаму бадзёрую песню.

— Дзень добры, пані Сонька. Таксама на маніфестацыю, а? Дык мо разам? — усміхнуўся прыгажэй за майскае сонца.

У такую раніцу і сказала бабка: „А хай цябе пекла каўкне".

— А там жа нядрэнна, — адказаў дзядзя Ваня. — Цёпла, кампанія не апошняя, зараз і смалы ўжо не хапае. Уся яна на дарогах ляжыць.

А потым стаяў я ў царкве, узіраўся ў сумныя абліччы Марыі і Марыі-Магдаліны, што трымаюць варту над чорным прамавугольнікам плашчаніцы, глядзеў і ў васковы твар распятага на крыжы Ісуса, і была ў мяне да Ісуса балючая крыўда: чаму якраз у першы дзень мая дазволіў нягоднікам зрабіць здзек над сваёй асобай? У той дзень, калі ў мястэчку гучаць духавыя аркестры, вуліцамі, пад музыку, маршыруюць жаўнеры ў парадных мундзірах, і дзяўчыны ў спартыўных касцюмах, і дзядзя Ваня, стоячы на трыбуне, пасылае з-за буйных, чорных вусоў ветлівую ўсмешку ўсяму свету, а ў кіёску, побач каталіцкага касцёла, упершыню пасля зімовага перапынку, прадаецца марожанае.

А з першага смутку сачыўся другі смутак: „Бедны дзядзя. Як жа зараз жыць яму, калі пасля смерці такія перспектывы?"

Нахабнае пытанне таўклося аб мае грудзі доўгія дні і месяцы, разгаралася пры нагодзе ўсякіх гарцэрскіх святкаванняў — тады менавіта запрашалі мы дзядзю Ваню, прысаджвалі яго да вогнішча, вязалі на шыю чырвоную хустку, а ён, паставіўшы твар да полымя, прыводзіў з далёкай мінуўшчыны, і перадаваў нам, абразкі вялікай славы.

І я таксама глядзеў у вогнішча, і вачыма душы бачыў як распаўзаюцца, надымаюцца чырвоныя языкі, і не бач калі бяруць у абдымкі дзядзю Ваню. З трэскам спапяляюцца ногі, што пратапталі не адну партызанскую сцежку, і рукі, якія ніколі не прамахнуліся, узяўшы на прыцэл варожы аб'ект, і вочы — яны ж заўсёды адсачылі пагрозу нябачную другім вачам. Уявіўшы такое, я крадком адыходзіў ад вогнішча, бегма ляцеў дахаты і, забіўшыся пад коўдру, доўга плакаў.

Было ў нас да дзядзі Вані асаблівае пачуццё. Мужское каханне, што ўзнікае ў супольнай барацьбе, асабліва, калі мэта такое барацьбы — перайначыць свет.

Вядома, ніколі не стаялі мы з дзядзем Ванем у акопах, цёмнай ноччу не выходзілі з пушчы, не маршыравалі пад зорамі ў напрамку чыгункі, каб там, адной хітра пастаўленай мінай спыніць жалезны кровазварот, што забяспечвае варожую армію ў бінт, амуніцыю і кансервы.

Не дазволіў нам лёс. Шкада.

А дзядзя Ваня — калі б абапірацца на сямейныя калігацыі — ніякі ён нам дзядзя. Хіба што рудому Віціку, як старэйшы брат ягонага бацькі, пана Косціка. Нам, згодна з местачковымі канонамі, аставалася афіцыйнае *проша пана,* або, нат і ўзяўшы пад увагу супляменнасць вуліцы, не нашмат інтымнейшае *пан Ян.* Аднак спакон вякоў мы клікалі яго дзядзем. І дзядзя Ваня частаваў нас цукеркамі: „Ну, смургелі, вучыцца і вырастаць. Айчына чакае афіцэраў, шахцёраў, ды і другіх спецыялістаў".

А пан Алёшка, які нягледзячы на свой дзевяноста дзевяты год, кожнае раніцы засядаў у мясной краме чаргу за свінінай або цяляцінай, даваў зусім іншыя прагнозы. Прыжмурыўшы вочы, зазіраў у сваю мінуўшчыну, вылузваў адтуль абадраных жабракоў, нанава ўладкоўваў іх пад цэрквамі і касцёламі, паклікаў на вуліцу доўгія шарэнгі беспрацоўных, а затым, запаўняючы паліцы кілбасамі і паляндвіцамі, пускаў у разгон чэргі, што нахабна гуртуюцца ў мясных крамах.

Дзядзя Ваня сумняваўся ў такіх выпадках, ці ў пана Алёшкі ад старасці не паблыталіся мазгі, а таксама казаў яшчэ, што мінуўшчына не вяртаецца, асабліва, калі мяжу між сённяшнім а ўчарашнім днём старажуюць адпаведныя людзі. У такія хвіліны нам хацелася стаць дарослымі, пераняць узняты дзядзем Ванем сцяг, ды разгарнуць яго на ўвесь свет.

— А дзядзя Ваня, ён праваслаўны, ці каталіцкі? — Зараз ужо не памятаю хто, як першы паставіў такое пытанне Віціку. Пачыналі мы неяк здагадвацца, што людзі ў мястэчку раздзяляюцца на тых, хто дзеля гутаркі з Усявышнім заходзіць у драўляную блакітную царкоўку, ды і другіх, якія з такой жа мэтай бяруць напрамак на белы, стральчаты касцёл у цэнтры мястэчка. Гулялі мы якраз *у сцізорык*, і Віцік, уладкоўваючы вастрыё сцізорыка на кончыку носа, неадразу даў адказ. А потым, загнаўшы як трэба вастрыё ў траву, зірнуў на нас вокам пераможца: „Ні такі дзядзя Ваня, ні сякі. Дзядзя — партыйны". Значыць — які? — усе вочы сышліся на рудой чупрыне. — Партыйны, — чалавек, які можа ўсё — удакладніў Віцік.

Здаралася — частаваў цукеркамі і бацюшка Сцяпан, калі пасля святаў Божага Нараджэння снаваў з хаты ў хату з малітвай. Ён таксама казаў нам вучыцца, ставаць лекарамі і афіцэрамі, слухаць бацьку, і маці, ды і другую ўладу. Ды што — бацюшка? Ніколі ж не быў ён у партызанах. А прытым не было пэўнасці: бацюшка Сцяпан — чалавек партыйны, хто можа ўсё? Як, скажам — дзядзя Ваня ...

На такое пытанне не дала адказу нат бабка Сонька. Паглядзела на мяне дзіўна неяк, адвярнулася, плюнула пад ногі. Прыпомніла таксама дзеда Валодзю — бачыла яго апошні раз у сорак трэцім, у студзеньскі вечар, калі збіраўся вартаваць чыгуначныя рэйкі. А ноччу ўзарваўся там ваенны эшалон.

— Усемагутны — там вось — паказала пальцам кухонную столь бабка Сонька.

Аднак новыя падзеі, што адбыліся з прыходам зімы, пярэчылі бабусіным тэорыям. Пасеялі таксама ў маёй свядомасці зусім слушныя падазрэнні: бабка, як і апошнія смяротныя, можа ж памыляцца. Пачынаў уяўляць я і куды страшнейшае: вось менавіта настане дзень, і над бабусяй, гарызантальна напружанай на покуці, бацюшка Сцяпан праспявае *Вечная памяць*, а потым суседзі прыбяруць яе з хаты, занясуць на могілкі, апусцяць у глыбокую яму і прысыплюць жоўтым пясочкам. Зусім так, як адбылося з панам Алёшкам, які быў самы старэйшы на нашай вуліцы, а па прычыне нестандартнай у дзевяноста дзевяць жвавасці, звалі яго Жалезным. І тая жвавасць, паводле вулічных меркаванняў, магла б адправіць пана Алёшку на бераг другога стагоддзя.

Аднак дзевятнаццатага снежня з раніцы пайшоў дождж, а адвячоркам неба пасвятлела і з усходу, ад пушчы вецер дзьмухнуў прымаразкам. Вулічны брук прыхарашыўся чыстым шклом.

Пан Алёшка, які здрамнуўся пасля абеду, якраз пралупіў вочы. Паблытаўшы адвячорак з досвіткам, накінуў на плечы абшастаную бараніцу, накіраваўся ў мясную краму.

У той дзень у праваслаўным календары адзначаўся святы Мікалай. І пан Косцік з дзядзем Ванем выпілі брацкую бутэльку. Апошнюю, што прыхавалася ў хаце.

У нас ніколі не адыходзяць ад стала з-за такой прычыны. Ну, хіба, каб злётаць у бліжэйшую краму. І пану Косціку прыйшлося сесці на матацыкл, і ні пры чым тут пратэст і лямянт пані Ніны, ягонай шлюбнай жонкі. У асаблівых выпадках жаночы рацыяналізм прымушаны скарыцца перад мужскім гонарам.

Але матацыкл не дайшоў да мэты. Мабыць, рука, самапасам, ад святочнай фантазіі надта моцна наехала на ручку газу? А можа вулічныя камяні, ад нечаканага холаду паднялі хрыбет вышэй за восеньскую норму? А можа, як пры нагодзе незразумелых здарэнняў кажа народ: проста так было трэба? Словам, сцежкі матацыкла і пана Алёшкі скрыжаваліся.

На пачатак з'явілася хуткая дапамога, але няшмат тут было працы. Лекар праверыў пульс, зазірнуў у знерухомелыя вочы пана Алёшкі і развёў рукамі, пацвярджаючы такім чынам людскую бездапаможнасць у канфрантацыі з нябеснымі рашэннямі. Потым бачылі міліцыянераў, якія валаклі пана Косціка ў напрамку сіняй *Нысі*. І пан Косцік не запіраўся, ён бесперапынна паўтараў *ясна холера* і *холера ясна.* І ні слова больш. Потым, калі ўжо суседкі аб'явілі ў чым справа, прыбегла пані Ніна, яна ўголас рыдала і плакала, і пыталася што рабіць адзінокай жанчыне, якое муж, па апошнія свае дні гніе ў астрозе. Затым гутарыў з міліцыянерамі дзядзя Ваня. Ад злосці, ён торгаў доўгія вусы, і даводзіў, што такія моцна пажылыя старэчы, на публічным шляху, без нагляду малодшых сямейнікаў, нішто другое як імперыялістычная правакацыя. А вуліца, брукаваная коўзкімі камянямі, асабліва ў нашай краіне — каласальны скандал і анахранізм. І наогул, час ужо навесці тут парадак.

А ноччу бачылі дзядзю Ваню на вакзале. Садзіўся ён на цягнік, і дванаццаць хвілін на трэцюю адправіўся ў Варшаву. Ці не да Герэка паехаў, брата ратаваць — здагадвалася вуліца. А затым глядзелі мы тэлевізар, як і штодзённа быў там пан Герэк, ён усміхаўся, гаварыў прыемныя словы, ды ў ніякім выпадку не паводзіў сябе як чалавек, у каго які-небудзь клопат.

Дзядзя Ваня вярнуўся пасля трох дзён, адразу сеў на службовую машыну і аднекуль прывалок пана Косціка.

Падвесну, ледзь снег паспеў адправіцца ў далёкае мора, заехалі на вуліцу экскаватары, дарожныя каткі, трактары і другія машыны, якія мы, бачыўшы ўпершыню, не ўмелі назваць. З аграмадных катлоў лілася на каменне чорная, кіпячая смала.

Так і ляжыць на вуліцы гадоў пад трыццаць ужо. На Правадную, калі раз у год наведваю наша мястэчка, якраз гэтай вуліцай кіруюся на могілкі.

Зараз за брамай адпускаю залатоўку бязногаму жабраку, затым купляю свечку, стаўлю яе на магілу бабкі Сонькі. „Хрыстос уваскрос" — малады, невядомы мне бацюшка перасоўваецца між помнікаў. Следам, з пасудзінай свянцонай вады ступае дзядзя Ваня. „Добрая была жанчына, веруючая," — падказвае бацюшку, калі ўжо спыняюцца над бабкай Сонькай. І ўсміхаецца — саноўна, ветліва, як чалавек, якому па прычыне даўгавечнасці, даручаюцца тайны найвялікшых справаў. Мабыць, бабка Сонька, разгарнуўшы райскія фіранкі воблакаў, таксама ўсміхаецца — на няўхільнае спатканне з дзядзем Ванем і другімі суседзямі.

Зорка

старонка для дзяцей

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Амелія Горбач з настаўніцай Бажэнай Ляўчук

Гайнавянка перамагла ў Сувалках

Амелія Горбач з Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы заняла першае месца ў катэгорыі гімназічных школ на Міжнародным фестывалі песні і танца „Muszelki Wigier", які праводзіўся ў Сувалках. У мерапрыемстве прынялі ўдзел вучні з Польшчы, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Расіі і Францыі.

— Выступленне на міжнародным фестывалі, гэта праверка маіх магчымасцей, — заяўляе Амелія. — У час музычных варштатаў, якія адбыліся перад конкурсным аглядам, мы вучыліся выступаць на сцэне.

Амелія Горбач пачала публічна спяваць у падставовай школе. Заняла першае месца ў калядным фестывалі „Кантычка", арганізаваным Бельскім домам культуры. Выступае ў гімназічным музычным калектыве, які дзейнічае ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Спяваць вучыць яе настаўніца музыкі Бажэна Ляўчук, з якой яна ездзіла ў Сувалкі.

Аляксей Мароз

Польска-беларуская крыжаванка № 18

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

	Korek	▼	Żyto	▼	Pas / Kawa	Dzban	▼	Klika	▼
Łóżko ▶			▼		▼	Punkt ▶			
Brat	Cecha ▶					Jak			
▶				Wianek ▶		▼			
	Kozak ▶								

Адказ на крыжаванку н-р 14: Голас, Об, сябра, малы, букет, шанс, сумка, кут, арліца, балт, тан. Вол, боб, куст, сем, ткач, блакіт, стан.

Узнагароды, **каляровыя алоўкі**, выйгралі: **Лукаш Гайдук** з Нарвы, **Наталля Герасімюк** з Новага Корніна, **Пётр Герасімюк** з Арэшкава, **Наталля Петручук** з Дубін, **Магдаліна Крыстасюк** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Дарагая „Зорка"!

Сардэчна вітаем Рэдакцыю і ўсіх чытачоў! На ўроках беларускай мовы мы пісалі лісты. Адрасатам рашылі выбраць цябе, „Зорка".

Вось некалькі слоў пра нас. Мы — вучні чацвёртага класа Пачатковай школы ў Дубінах. Наша школа новая, прыгожая. Нашы вучні — жыхары многіх вёсак: Дубін, Навасад, Васількова, Ліпін, Рэпіскаў, Катоўкі, Пераходаў. У школу даязджаем на школьных аўтобусах. У школе мы вывучаем розныя прадметы. Важнае месца ў нашай навуцы займае беларуская мова. Мы выпісваем „Ніву". На ўроках займаемся з „Зоркай".

Ромак, Славік, Паўліна, Бася, Пётр, Моніка, Агата, Наталля, Міхал — вучні IV класа

Ад рэдакцыі: Прывітанне, сябры! Прыемна ведаць, што чытаеце „Зорку" ды цікава праводзіце ўрокі беларускай мовы.

Вершы Віктара Шведа

Калі я буду пудрыцца?

Раненька, перад выхадам на працу,
Ля люстра пудрылася матуля.
З цікавасцю ёй стала прыглядацца
Дачушка падрастаючая, Уля.

І запытаць любую маму
Дачушцы вельмі не цярпіцца:
— Калі такой вялікай стану,
Каб пудру класці замест мыцца?

Матросы

Біёлаг пытаецца: — Вера,
Я сёння даведацца мушу,
Як называюцца зверы,
Што жывуць і на моры, і сушы?

— Гэта матросы, вядома.
Была на экскурсіі з мамай,
Я бачыла іх на пароме,
На вуліцы ў Гданьску таксама.

Сяргей Новік-Пяюн

Веснавы малюнак

Белы бусел плавае над лесам.
Сонца сыпле золата паток.
Звоняць птушак песні-пералівы.
На цымбалках грае ручаёк.

Па мураўцы бегаюць мурашкі.
Поўзаюць зялёныя жучкі.
Вылятаюць дружна з вулляў пчолкі.
У паветры ўюцца матылькі.

Сінёна

Усім „сваякам" з II „а" белгімназіі ў Гайнаўцы

У праўды паэтаў свет багаты...
Пачну ад нашай Малгажаты,
З ёю Марта на ўроках
Размаўляе аб аблоках.
За імі Базыль з Мар'янам
Думаюць пра палёт аэрапланам.
Ля акна сядзяць тры Анкі,
Да іх Даротка — гэта каляжанкі.
А перад імі? Эвеліна!
Сакавітая як маліна.
Магда зялёныя свае вочы,
Звяртае на Сенчыны варкочы.
А Флёрэк, каб сцяна не ўпала,
То падпірае, каб доўга стаяла.
Томак кінуў у Кшыся сшыткам,
А Кшысь крычыць: „Эй, ты там!"
Моніка не хоча абцяць варкоча.
Патрыцыя кажа: „З варкочам уроча".
Беатка з Магдай размаўляе,
А Магда „лёчкі" папраўляе.
Міхал з Мар'юшам пішуць дыктоўку
І пра вынікі вядуць размоўку.
Паўліна піша ліст сяброўцы.
Паўлінка і „Госяк" гэта анёлкі.
Адам думае пра Малыша.
Кацпар на скокі рэцэнзію піша.
На перапынак чакае Уля з Мартай.
Марта дзяўчынкай ёсць упартай.
Наталька з'яўляецца пільнай вучаніцай,
Марта з Монікай так кажуць зазвычай.
І яшчэ хтосьці ёсць у II „а"...
Хто? То пан Чыквін — наш выхаваўца!

Зорка № 1
05-01-2003

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Вучні II і III класаў з выхавацелькай Лідзіяй Панькоўскай

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У конкурснай камісіі працавалі (злева): Тамара Русачык, Вольга Андраюк і Вольга Сянкевіч

У Арэшкаве адганялі зіму

9 красавіка г.г. — калі за вокнамі зноў зрабілася бела ад снегу — у Пачатковай школе ў Арэшкаве арганізавана супрацьдзейнае надвор'ю мерапрыемства — радасную лінейку пад лозунгам „Вясна — вярніся!" Перад школьнай публікай запрэзентаваліся вучні другога і трэцяга класаў.

Чаму такая накіраванасць лінейкі? Сёлетняя зіма, якая доўжылася амаль паўгода, прычыніла многа клопату і бацькам, і дзецям, і настаўнікам. Асабліва ў сакавіку, калі здавалася, што ідзе зіме канец, многія дзеці хварэлі, прысутнасць на ўроках панізілася. Неспадзяванае вяртанне зімы схіліла выхавацельку Лідзію Панькоўскую да пошукаў новага, добрага спосабу „прагнання" зімы і прывітання вясны — гэтым разам багацей і больш напорыста. Задуму выхавацелькі ахвотна падтрымалі вучні і надзейна падрыхтаваліся да мерапрыемства.

Выхавацелька намалявала вялікі плакат з выявай святочнага зайца-веласіпедыста з крашанкамі ў кошычку на плечах і з букетам кветак. На заднім плане было прадстаўлена прабуджэнне цэлай прыроды. Каб менавіта такая вясна, якая была нарысавана на плакаце, вярнулася да ўсіх, было вырашана прывітаць яе вельмі весела. Было многа веснавых песень, вершаў і радасных танцаў.

Спачатку выступілі вучні другога класа: Крыстыян Дунда, Караліна Навіцкая і Марта Дэмянюк з вершам п.з. „Ліст ластаўцы". Пазней вучні абодвух класаў пад магнітафонны акампанемент заспявалі песню „Птушкі чакаюць пісьма". Верш „Што робіш шпачок?" прадэкламавалі вучні другога класа Эвеліна Дунда і Марыюш Харашэўскі, „Ідзе вясна" — Марта Дэмянюк (II кл.), „Вясна" — Іаанна Галёнка (III кл.) і „Зялёны верш" — Тамаш Міхалоўскі (III кл.). Хор вучняў з абодвух класаў праспяваў песні „Вітай вясна" і „Прыйшла пані вясна" ды рэфрэн да песні пра красавік, сольныя звароткі якой выканалі Марта Дэмянюк ды Эвеліна Дунда.

Выступленне вучні закончылі народным танцам горцаў „Траяк". Дзяўчынкі былі апрануты ў аднолькавыя сіне-белыя спаднічкі і ў белыя блузачкі, на якіх былі відны каляровыя пацеркі. На галовах дзяўчынак былі вяночкі, выкананыя з дапамогай бацькоў і настаўніцы беларускай мовы Ірэны Герасімюк. Пастаноўку танца рыхтавалі на ўроках фізкультуры.

На заканчэнне лінейкі голас узяла дырэктар школы Гражына Бэрэзняк, якая сардэчна падзякавала вучням II і III класаў і іх выхавацельцы Лідзіі Панькоўскай за вельмі цікавую ідэю лінейкі і салідную падрыхтоўку выканаўцаў. Заахвочвала яна да ладжання падобных лінеек на прыкладзе малодшых вучняў.

* * *

Як паказала надвор'е, зіма неўзабаве пачала адступленне. Мо гэта і сапраўды заслуга вучняў з Арэшкава?!

Міхал Мінцэвіч

Пра ўзровень дэкламатараў

У раённых элімінацыях дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова", якія адбыліся 2 красавіка ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прынялі ўдзел 136 удзельнікаў.

— Узровень выступленняў быў добры, але, на жаль, паўтараліся творы. Падбіраючы тэксты настаўнікі павінны глядзець на асабістыя прыкметы вучняў. Не павінны нагружаць іх творамі, якіх дзеці і моладзь не разумеюць, — заўважыла старшыня конкурснай камісіі Тамара Русачык. — Не кожны вучань можа паказаць дэкламатарскія здольнасці. Важна, што дзеці і моладзь хочуць публічна выступаць і спаборнічаць з аднагодкамі. Расслаўляюць яны свае школы і спрычыняюцца да поспехаў у міжшкольных рэйтынгах. Самы высокі ўзровень паказалі гімназісты. Перамаглі вучні, якія патрапілі гуляць са словам.

Вучні дэкламавалі творы Яна Чыквіна, Алеся Барскага, Васіля Петручука, Міхася Шаховіча, Юркі Баены, Зосі Сачко. Паўтараліся творы эміграцыйных пісьменнікаў — Наталлі Арсенневай і Алеся Золака. Члены камісіі звярталі ўвагу на падбор рэпертуару, яго інтэрпрэтацыю, правільнае вымаўленне і ўмеласць мастацкай прэзентацыі тэкстаў. Усе лаўрэаты паехалі ў Нараўку на цэнтральны конкурс „Роднае слова". Пра іх поспехі мы пісалі ў папярэдніх нумарах „Зоркі".

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Эмілія Місяюк з Чыжоў

Майскі вецер

На самай сярэдзіне Вялікай зямлі зацвіў на досвітку чароўны сад. Сюды зляцеліся птушкі, пчолы, матылі. Птушкі — каб уславіць песнямі гэты сад, пчолы — набраць нектару з кветак, матылі — паласавацца салодкім пылком.

Слава пра чароўны сад паляцела далёка за моры-акіяны, на поўнач і поўдзень. Дайшла яна і да Сухавея. Стары і раскудлачаны, ён ляжаў на гарачым пяску і цяжка дыхаў. Ад яго дыхання падалі ніц расліны, перасыхалі ручаі. Радаваўся Сухавей: усюды парадак — нідзе ні травінкі, ні былінкі, толькі жоўты пясок, які можна перасыпаць як хочаш, нішто не перашкаджае.

І раптам — сад! Ды яшчэ цвіце! Узлаваўся Сухавей. Ускочыў на ногі, трапянуў крыламі:

— Спалю!

І паляцеў шукаць той сад.

А на поўначы жыў другі вецер — Снегавей. Ён ляжаў на вялікай ільдзіне і дзьмуў на акіян, які спачатку адбіваўся ад яго высокай хваляй, а потым пацішэў, скарыўся і схаваўся ў падполлі тоўстых ільдоў. Снегавей прыўзняў заінелую бараду, з замілаваннем аглядаў наваколле — бязлюднае, белае. А калі пачуў пра сад — таксама ўзлаваўся.

— Замарожу! — крыкнуў так, што са звонам пасыпаліся з барады льдзінкі. І паляцеў шукаць той сад.

Далёка наперадзе пачуў ён посвіст гарачых крыл. І здагадаўся: гэта — Сухавей. Ах, як ён ненавідзеў гэтага старога! Не раз сутыкаліся яны грудзі ў грудзі, але не маглі перамагчы адзін аднаго.

І Сухавей не хаваў сваёй злосці. Ён стараўся апярэдзіць Снегавея. І гнаў перад сабою сухое лісце, пыл, гарачы пясок, каб спаліць чароўны сад.

Сустрэліся вятры на прасторным полі, пасярод якога стаяў векавечны дуб у калматай шапцы. І вырашылі біцца да смерці. Усю ноч дрыжэла поле, трашчала сучча дрэў у недалёкім лесе. Нават векавечны дуб не вытрываў і схапіўся за галаву: баяўся, што ўпадзе на дол яго новая шапка.

А вятры ўсё круціліся ў полі, стагналі і вылі ў смяротным паядынку. Нарэшце схапіліся загрудкі, моцна спляліся крыламі. І Снегавей адчуў, як памякчэла яго сэрца ад цяпла Сухавея. А Сухавей астыў, і ўраз прайшла яго злосць. Ён суцішыўся. Так і стаялі вятры ў абдымку, пакуль не ператварыліся ў ласкавы майскі вецер. Раставалі ледзяныя хмары, якія прывалок з сабою Снегавей. Да раніцы ішоў спорны вясновы дождж. Ішоў полем, лугам, лесам. Дайшоў да саду, і на яго квецені заззялі крыштальныя дажджынкі. Сад стаў яшчэ прыгажэйшым.

Сонца ўзыходзіла і заходзіла. Дзень змяняўся ноччу. Паспелі ў садзе яблыкі, крамяныя, сакаўныя, смачныя. Іх хапіла ўсім дзецям на Вялікай зямлі.

Вось і ўсё. Не стала злых вятроў. Але ў вятроў, як і ў людзей, ёсць дзеці. Яны вырастаюць і становяцца добрымі альбо злымі. І таму трэба заўсёды берагчы наш чароўны сад.

Ніна Маеўская

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Наталля Герасімюк перад куфрам з тканымі вырабамі

Паказ ткання

Вучні гайнаўскіх і навакольных школ пачалі з 8 красавіка наведваць выстаўку ткацтва ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы. Бібліятэкарка Наталля Герасімюк, якая ладзіла экспазіцыю, паказвае вучням вырабы і ткацкія прылады.

Прасторная музейная зала падзеленая, як старыя вясковыя хаты, на тры часткі. У гаспадарчай частцы знаходзяцца прылады, якімі ў мінулым рыхтавалі ніткі і ткалі. Стаяць там церніцы, шчоткі, калаўроткі, матавілы і кросны. У другой частцы хаты, прадбачанай для адпачынку, стаіць куфар, вісяць і ляжаць тканыя капы (накідкі). На навалачках прыгожыя гафты. Побач іх ляжаць абрусы і стары тканы саян. У апошняй частцы залы вісяць ручнікі, упрыгожаныя вышыванымі ўзорамі. Гэтая частка прадбачана для малітваў і духоўнага размышляння. У яе цэнтры знаходзіцца ўпрыгожаная ручніком ікона, а на століку ляжыць Евангелле. Каля сцен развешаны дэкаратыўныя асновы.

— Рашыліся мы на ткацкую выстаўку, бо на нашым складзе былі ткацкія прылады працы. Тканыя вырабы сабірала я ад прыватных асоб, — заяўляе Наталля Герасімюк.

Расказ для вучняў пачынаецца ад прыладаў працы, якія пастаўлены згодна чарговасці працэсу выконвання нітак і ткання. Многія вучні не ведаюць як карысталіся імі вясковыя жанчыны і таму патрэбна практычная дэманстрацыя.

— Арганізацыя выстаўкі яшчэ не закончылася. Я запрасіла жанчын, каб падрыхтавалі лён, воўну і заткалі кросны для практычнай дэманстрацыі. У будучыні хачу ў гэтай зале наладзіць вучням практычныя заняткі ткання і вышывання. Ужо ёсць жанчыны, якія згодны пераказваць свае ўмеласці, — гаворыць Наталля Герасімюк. — Планую, што гэтая выстаўка стане пастаяннай і будзем яе папаўняць. На выстаўцы змяшчу фатаграфіі, на якіх паказваецца як людзі слалі і пралі лён.

У выставачную залу прыходзяць таксама дарослыя асобы. Жанчынам падабаюцца вышываныя ручнікі і тканыя капы. Некаторыя вырабы зноў сталі моднымі і карыстаюцца імі ў гарадскіх кватэрах.

Аляксей Мароз

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Партрэты пагранічча

Несумненна, адной з найважнейшых культурных падзей гэтага года ў Беластоку будзе выстава „Ex Oriente Lux", прэзентаваная ў галерэі „Арсенал". Ганаровы патранат над ёю ўзялі міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч і маршалак Падляшскага ваяводства Януш Кшыжэўскі.

Ідэя гэтай выставы выйшла ад Гжэгажа Дамброўскага, фотарэпарцёра „Выбарчай газеты", які падмацоўвае свой варштат у адной з чэшскіх школ фільму і фатаграфіі.

— Ідэя такое выставы нарадзілася ўжо два гады таму, — прызнаецца Дамброўскі.

Аднак, вернісаж адбыўся толькі цяпер, дзень да падпісання Уваходнага трактата ў Афінах, у рамках якога м.інш. Польшча мае стаць членам Еўрасаюза. На выстаўцы прадстаўлены каля 170 здымкаў, з ліку 20 тысяч выкананых дзесяццю фатографамі, зробленымі ад Друскенік па Лапухова. Гэтыя фатаграфіі — запіс людзей, штодзённых падзей і месцаў беларуска-польскага і польска-літоўскага пагранічча, пачаткаў нашага стагоддзя і тысячагоддзя, ледзь не дзень да новага ладу ў Еўропе. Здымкі не падпісаны прозвішчамі аўтараў, бо, як сцвярджае Гжэгаж Дамброўскі, справа не ў экспанаванні сябе, а прадстаўленні праекта.

На вернісажы ў „Арсенале" паявіліся тлумы. Афіцыйныя госці былі ў перамешку з людна сабранай моладдзю, таксама з Гайнаўшчыны і Бельшчыны. З зацікаўленнем аглядалі фатаграфіі м.інш. дэпутат Яўген Чыквін і член падляшскай управы Ян Сычэўскі.

Арганізацыяй паказу занялася Магдалена Гадлеўская-Сівэрская, старшыня Згуртавання дзеля эстэтычнай адукацыі. Будзе паказвацца яна ў галерэях Польшчы і Заходняй Еўропы. Некаторыя з фатаграфій-партрэтаў пагранічча можна пабачыць на інтэрнэтавых старонках: <www.photodocument.pl>.

(холм)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Выстаўку адкрылі (справа) Ян Хіліманюк, Павел Латушка і Васіль Шаранговіч

Літаграфіі, гравюры і акварэлі

У Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы з 14 красавіка адкрыта выстаўка літаграфій, гравюр і акварэль беларускага мастака з Мінска Васіля Шаранговіча. Суарганізатарамі выстаўкі з'яўляюцца Музей сучаснага выяўленчага мастацтва Міністэрства культуры Беларусі ў Мінску, Пасольства Беларусі ў Варшаве і Генеральнае консульства РБ у Беластоку. Ініцыятарам выстаўкі з'яўляецца беларускі пасол Павел Латушка, які разам са старшынёю Камітэта пабудовы гайнаўскага музея Янам Хіліманюком і беларускім мастаком адкрыў мерапрыемства. На ўрачыстасць прыбылі сенатар Сяргей Плева, старшыня БГКТ Ян Сычэўскі, беларускія дыпламаты, кіраўнікі мясцовых самаўрадаў, прадстаўнікі культурных і адукацыйных устаноў з Беласточчыны. Прысутны быў прадстаўнік епіскапа Гайнаўскага Мірана, протаіерэй Мікалай Кулік.

— Прафесар Васіль Шаранговіч, гэта выдатны беларускі мастак, — заявіў пасол Павел Латушка. Вядомасць у свеце прынеслі яму партрэты, разнародныя кампазіцыі, якія сталі ілюстрацыямі да творчасці беларускіх паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа і пейзажныя малюнкі. У Польшчы вядомы яго ілюстрацыі да паэмы Адама Міцкевіча „Пан Тадэвуш". Васіль Шаранговіч атрымаў званні заслужанага дзеяча мастацтваў, народнага мастака Беларусі, заслужанага дзеяча культуры Польшчы і дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь. Вядомы ён таксама як педагог. Трыццаць гадоў працаваў выкладчыкам у Беларускай акадэміі мастацтваў, а апошнія дзевяць гадоў быў яе рэктарам. Ад шасці гадоў з'яўляецца дырэктарам Музея сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску.

— Адкрыццё выстаўкі з'яўляецца для Гайнаўкі сапраўдным беларускім святам. Яна вельмі блізкая нам, бо ведаем мы творы ілюстраваныя працамі Васіля Шаранговіча. Кожная літаграфія ці акварэль пацвярджаюць клімат ілюстраваных твораў, — сказаў Віктар Кабац.

Большасць літаграфій, гравюр і акварэляў паказаных на выстаўцы, выкарыстаны як ілюстрацыі да творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа і Адама Міцкевіча. Побач іх знаходзяцца працы з цыкла „Памяці вогненных вёсак" і акварэльныя пейзажы. Васіль Шаранговіч падарыў гайнаўскаму музею ілюстраваныя яго карцінамі (выдадзеныя на беларускай, польскай і рускай мовах) паэмы „Пан Тадэвуш" Адама Міцкевіча і „Новая зямля" Якуба Коласа, свае літаграфіі і гравюры. Будуць яны выстаўлены ў музеі як частка пастаяннай экспазіцыі.

— У будучыні плануем арганізаваць у гайнаўскім музеі выстаўку фатаграфій, прымеркаваную да мінулагодняга святкавання 120-х угодкаў з дня нараджэння Якуба Коласа і Янкі Купалы. Хочам наладзіць таксама выстаўкі прац сучасных мастакоў з Беларусі, — паінфармаваў пасол Павел Латушка. Уручыў ён старшыні Яну Хіліманюку беларускі тэлевізар „Віцязь" і абяцаў дасылаць відэакасеты з беларускімі фільмамі. Выстаўку можна наведваць да паловы мая з панядзелка па пятніцу з васьмі гадзін раніцы да трох пасля абеду.

Аляксей Мароз

Шум вечнай калыханкі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Яшчэ ездзіць поезд з Беластока ў Бельск і з яго вокан можна пабачыць дбайна абгароджаную бярозу недзе пасярэдзіне між станцыямі ў Бельску і Райску. Задзівіла мяне гэта, бо ж бяроза тая не здалася мне помнікам прыроды. Рашыў я высветліць, у чым там справа.

Каля абгароджанай бярозы няма ніякай інфармацыі пра той дзіўны аб'ект. Але з вонкавага боку загарады ляжалі бетонныя пліты, а верхняя з іх з дбайна выразаным лацінскім крыжам была пастаўлена вертыкальна — чарговая загадка, для высвятлення якой падаўся я ў найбліжэйшую хату.

Гаспадыня, Марыя Марчук, сказала мне, што за бярозай распаложаны велікаватыя могілкі, на якіх у час першай сусветнай вайны пахавалі загінуўшых салдатаў: ад поўдня немцаў, а з поўначы рускіх. Калісь былі яны абгароджаны бетонным плотам, а ад шашы з Бельска ў Мулявічы стаяла вялікая брама на шасці слупах, наверсе якой начавалі арэхавіцкія хлопцы калі прыганялі коней на суседні выпас. У міжваенны перыяд тых могілак ніхто не даглядаў, а адзін гаспадар нават забраў на свой панадворак некалькі намагільных пліт.

Калі насталі немцы, яны рашылі ўпарадкаваць могілкі. Рабілі гэта жыхары Арэхавіч, у іх ліку і спадарыня Марыя Марчук. Усе магілкі — і нямецкія, і рускія — былі абкладзены дзёранам, а дарожкі між магіламі былі пасыпаны жоўтым пясочкам. Той гаспадар, які быў пакарыстаўся намагільнымі плітамі, вярнуў іх на прызначанае ім месца.

Калі немцы адышлі, могілкі зноў апынуліся на волі лёсу. Агароджа ветрала і развальвалася, а магілкі і дарожкі між імі сталі зарастаць усялякай расліннасцю. І бадай тры гады таму нехта надумаў абгарадзіць, але толькі адну старую бярозу. Спадарыня Марчук не скрывае свайго незадавальнення такім дзіўным рашэннем, якое праігнаравала агромную большасць могілак...

Можа і баліць ейнае сэрца, калі бачыць, як марнуецца яе колішняя, хай і не зусім дабравольная, праца. Але крыху святла на гэтую справу праліла мне далейшая гутарка з ёй. У ходзе гутаркі пра мінулае, яна сказала, што перад самай вайной саветы прызвалі ў сваю армію яе брата. Савецкіх жа салдатаў не шкадавалі ні ворагі, ні свае камандзіры — асабліва жахлівы быў пачатковы перыяд вайны — і я здагадкава спытаў:

— І не вярнуўся?

— Вярнуўся! Калі адыходзіў з хаты, мама дала яму крыжык і ў нагавіцы зашыла іконку. Дала яму яшчэ на дарогу іголку з ніткай, каб тую іконку перашываў, калі будзе мяняць вопратку. Ён пасля трапіў у польскае войска і пад Варшавай быў ранены ў шчаку. Лячылі яго ў шпіталі ў Гайнаўцы і калі выздаравеў, зайшоў дахаты. Паеў і падаўся ў сваю часць. Пасля вайны вярнуўся дахаты ў польскім мундзіры, які пазней банды забралі. І я сваім сынам давала крыжык і іконку святога Мікалая Спасіцеля, што ў царкве купіла. І гэтак завялося ў нашай сям'і: і мая дачка так выпраўляла свайго сына. І калі хлопец возьме іконку, то яна памагае, а калі адкінецца, то і Бог ад яго адкінецца. Я сама кладу іконку ў сумку, калі куды выбіраюся. І малюся: адну малітву канчаю і пачынаю наступную...

Установа, каторая гарадзіла частку могілак, якая б яна не была, функцыянірує не ў трансцэдэнтальным свеце малітвы, толькі ў свеце рэальных кесаравых каардынат. Не хапіла іх мабыць на поўную агароджу, адно на сімвалічную. Дарэчы, калі б было дастаткова яе многа, нашы практычныя людзі зрабілі б з ёю тое, што і раней з плітамі. А ўганараваная агароджай бяроза быццам агромністы бярозавы крыж распасцірае сваё голле над прахамі забытых у чужыне пакойнікаў, а шумам сваіх вітак адпраўляе вечную паніхіду за іх душы.

Аляксандр Вярбіцкі

Рэквіем

Памірала... Гледзячы на сваю бабульку, яна ўспомніла Геню.

Гені было 75 гадоў. Яна цудоўная жанчына, якой сэнсам жыцця быў сын. Быў, таму што няма яго ўжо на свеце. Пакінуць белы свет дапамагла яму жонка і „адданыя" сябры. Адышоў пяць гадоў таму, а Геня кожны дзень плакала і тужыла. Генін муж прыкідваўся самым пакрыўджаным чалавекам, быццам усё рабіў, самую цяжкую работу, а ніхто яму за гэта не дзякаваў. Праўда, аднак, такая, што ён не ўмеў нічога зрабіць, толькі распавядаць пра свае ўяўныя крыўды. Геніна нявестка — хітрая жанчына. Усю маёмасць узяла сабе, а тое, што змагла, прадала.

Гледзячы на сваю бабульку, яна ўспомніла час, які правяла з Геняй — усе супольныя хвіліны, слёзы радасці, надзею якой жыла, што сын шчаслівы. Гледзячы на бабульку яна бачыла Геню, якая ўсміхаецца, калі яна здала экзамен або плакала, калі яна расставалася з любым чалавекам. Бачыла яе сівыя валасы, сумныя вочы і радасць, калі дапамагала іншым. Яна памятала словы аб дапамозе, шчасці. Памятала рукі, якія многа дапамагалі ў хваробе. Яна бачыла боль, калі праглядаючы здымкі з вачэй ліліся слёзы, калі нявестка выганяла за дзверы з уласнай хаты, калі яе абманвалі.

Яна стаяла пры ложку ў бальніцы. Душа крывілася, бо доктар сказаў, што бабулька памірае. Такі сам боль, цярпенне яна пазнала ўжо раней. Калі не стала Гені, усё апусцела. Карціну з палаты інтэнсіўнай тэрапіі цяпер перабіў вобраз крыжа, які стаіць на маленькіх могілках.

Штодня ў бальніцы яна глядзіць на бабульку. Раз бледную, раз з гарачкай. Бачыць яе сінія вочы, празорлівыя, быццам усё ведаюць. Моліцца, каб не ставіць яшчэ другі магільны крыж...

Анна Садоўская

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гімназісты з дырэктарам Васілём Ляшчынскім і айцом Славамірам Ярацэвічам

Сярод пераможцаў

Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім апынулася сярод пераможцаў рэйтынгу гімназічных школ, арганізаванага „Выбарчай газетай" і Кураторыяй асветы ў Беластоку. Бельскую белгімназію, якая разам з Публічнай гімназіяй н-р 18 у Беластоку заняла шостае месца, апярэдзілі толькі беластоцкія школы і найлепшая гімназія з Ломжы (прынялі ўдзел 55 школ з Падляшскага ваяводства).

— Мы асабліва не рыхтаваліся да спаборніцтва паміж гімназічнымі школамі, але апісалі нашую працу. З матэрыялам, які трэба было даслаць арганізатарам конкурсу, знаёміліся па Інтэрнэце, — заяўляе дырэктар Васіль Ляшчынскі. — Цяжка было нам спаборнічаць з невялікімі беластоцкімі грамадскімі гімназіямі, у якія прыходзяць найлепшыя вучні. Мы павінны прымаць усіх, якія хочуць вучыцца беларускай мове. Добрае месца ў рэйтынгу, гэта гонар для школы. Узмацняецца значэнне нашай гімназіі ў асяроддзі і мы лічым, што дзякуючы нашым поспехам будзе больш кандыдатаў ахвотных паступіць у нашую школу.

83% мінулагодніх выпускнікоў з „тройкі" пайшлі вучыцца ў агульнаадукацыйныя ліцэі, іншыя ў тэхнікумы і прафесійныя ліцэі. Толькі 3 вучняў рашыліся вучыцца ў прафесійных школах. 7 белгімназістаў у мінулым школьным годзе сталі лаўрэатамі ваяводскіх элімінацый прадметных конкурсаў, што з'яўляецца выдатным поспехам невялікай школы (345 вучняў). Добрых вынікаў дабіліся вучні белгімназіі ў час вонкавых экзаменаў (здабылі ў сярэднім каля 33 балаў) і могуць пахваліцца спартыўнымі поспехамі ў ваяводскіх і агульнапольскіх спаборніцтвах. У агульным падліку зробленым па школьных поспехах бельская белгімназія апынулася на 3 месцы. Умовы працы ў „тройцы" добрыя, але школа атрымала за іх мала балаў. Патраціла за арганізацыю сваёй працы. Заняткі канчаюцца зімой вечарам і адбываюцца ў суботы. Усё гэта робіцца, каб як найбольш бельскіх вучняў магілі паступіць у белгімназію і вучыцца беларускай мове.

— Некаторых козыраў нашай школы мы не паказалі, бо пытанні былі незразумелымі. Паінфармавалі аб адным камп'ютэрным кабінеце, хаця ў школе існуюць два. Думалі, што другі трэба прыпарадкаваць для нашай падставовай школы. Не далі нам дадатковых балаў за вялікую гімнастычную залу, якіх мала ў ваяводстве, — кажа дырэктар Васіль Ляшчынскі. — Аднак, каб прыцягнуць у сваю школу дзяцей і дабіцца добрых поспехаў у вучобе, трэба мець прыстойныя ўмовы працы і добрыя школьныя будынкі. За разбудовай нашай школы трэба было многа нахадзіцца. Адбывалася гэта ў часы, калі цяжка было атрымаць згоду на інвестыцыю.

Васіль Ляшчынскі стаў дырэктарам Падставовай школы з беларускай мовай навучання ў 1975 годзе. Тады школа займала адзін паверх у будынку белліцэя. Будова асобнага будынка, спалучанага з ліцэем, распачалася ў пачатку васьмідзесятых гадоў і закончылася ў 1985 годзе. Ад гэтага часу амаль у два разы пабольшала колькасць дзяцей паступаючых у школу. Пасля заканчэння будовы дыдактычнага будынка, грамадскім пачынам распачалі будаваць гімнастычную залу. За грошы з Бацькоўскага камітэта купілі сталь на галоўную канструкцыю, а бацькі рабілі пад яе катлаван.

— Не давалі сродкаў на будову залы і дакументацыю трэба было выконваць за грамадскія грошы. Дырэктар Бельска-Падляшскага будаўнічага прадпрыемства Юрый Дзмітрук без дамовы прадаўжаў рэалізаваць распачатую грамадскімі сіламі інвестыцыю. Дамову падпісалі пасля прыдзялення грошай з гарадскога бюджэту, — гаворыць дырэктар Ляшчынскі. — Сродкі з кураторыі трэба было выхадзіць. Арганізавалі мне спатканне з міністрам адукацыі і з цэнтральнага раздзелу атрымалі мы выдатную дапамогу. Дазволіла гэта паскорыць інвестыцыйныя працы і пасля закончыць будову.

Аляксей Мароз

Белавежская гміна

Змяншаецца лік жыхароў

Калі ў 2000 годзе ў Белавежскай гміне пражывала 2 977 чалавек, дык цяпер іх 2 906. Па-за Белавежай, у Чарлянцы жыве 112 асоб, у Тэраміскіх — 87 і ў Будах — 68. У Чарлянцы на працягу трох мінулых гадоў лік насельнікаў паменшыўся на адзінаццаць і ў Тэраміскіх — на два.

У Белавежскай гміне зараз шмат састарэлых жыхароў. Сёлета ў першым кварталe ніхто тут не ставаў пад вянец (у мінулыя гады найбольш вяселляў было ў чэрвені, ліпені і верасні), нарадзілася ўсяго двое дзяцей ды памерлі дзевяць чалавек. Бацькі сваім нованароджаным дзецям давалі найчасцей імёны Наталля, Кінга, Ева, Аляксандра, Марыя, Себастыян, Кшыштаф, Якуб, Міхал, Павел і Мацей.

(яц)

Беларуская дзесяцігодка ў Орлі

Па дамоўленасці з нямецкім камандаваннем 22 верасня 1939 года прыйшла на Беласточчыну Чырвоная Армія. Нашы землі былі аб'яднаныя з БССР. Капітан Чырвонай Арміі Лейкін пачаў арганізаваць у Орлі сельсавет. Асветныя ўлады ў кастрычніку гэтага ж года прыступілі да арганізавання на Беласточчыне пачатковага і сярэдняга школьніцтва. У той час, калі ў БССР праводзілася страшэнная русіфікацыя, савецкія ўлады ў доказ таго, што тут у нас таксама Беларусь, арганізавалі школы пераважна з беларускай мовай навучання. У Орлі, з перавагай яўрэйскага насельніцтва, арганізавалася беларуская дзесяцігодка. Прыйшлі сюды вучыцца дзеці з навакольных сёл і неўзабаве школа ў сапраўднасці была з перавагай беларускай моладзі. Пакуль што найвышэйшым класам у нашай дзесяцігодцы быў пяты, у якім вучыліся выпускнікі польскай даваеннай сямігодкі. Не было клопату са школьнымі падручнікамі — прывезлі іх з Мінска. Найбольшым клопатам аказалася камплектацыя настаўніцкага саставу. Настаўнікаў, валодаючых беларускай мовай, прывезлі таксама з Беларусі. Галоўнай асобай з прыезджых быў энергічны мужчына, гісторык па адукацыі — Антон Вісаковіч, які стаў нашым завучам (загадваючым вучылішчам). Беларускую мову пачаў навучаць худы, бледнатвары малады мужчына, вельмі хворы туберкулёзам лёгкіх. Пасля года настаўніцкай працы памёр ён у беластоцкай бальніцы. Прыехаў яшчэ да нас прыгожы малады настаўнік, Павел Тычына, які надта падабаўся нашым дарастаючым дзяўчатам. Вучыў ён нас аднак нядоўга — прызвалі яго ў Чырвоную Армію. З прыезджых быў яшчэ дасканалы настаўнік рускай мовы, здаравяка, які, калі мы яго знервавалі, так моцна ўдарыў кулаком у парту, што выскачыла з яе чарніліца. Іншыя настаўнікі дзесяцігодкі паходзілі або з цэнтральнай Польшчы, або з Беласточчыны. Навучала нас алгебры настаўніца яўрэйскага паходжання — Лея Юнгерман, якая ўцякла з акупаванай немцамі Варшавы. З цэнтральнай Польшчы быў таксама настаўнік батанікі Смерэка. Шматгадовы кіраўнік даваеннай польскай сямігодкі ў Орлі, Тадэвуш Врублеўскі, вучыў нас нямецкай мове. Пасля года працы савецкія ўлады арыштавалі яго за ўдзел у вайне з бальшавікамі ў 1920 годзе і пасадзілі ў беластоцкую турму. Вызвалілі яго немцы і працаваў ён перакладчыкам у арлянскай гміне. Жонку Тадэвуша, Марыю, (таксама настаўніцу) з дзяцьмі Данутай і Веславам саветы вывезлі ў Сібір і пасля вайны вярнуліся яны ў Польшчу. Працавалі яшчэ ў дзесяцігодцы ў Орлі настаўнікі, якія паходзілі з Беласточчыны: Ілья Федаровіч, які ў пасляваенны перыяд дзейнічаў у Ваяводскай радзе нарадовай у Беластоку і Рыгор Трашчотка, родам са Старога Беразова, настаўнік фізкультуры, якога забілі потым немцы. Васіль Лашкевіч, родам з Орлі, быў дасканалым матэматыкам.

Перад настаўнікамі мясцовага паходжання асветныя ўлады паставілі надта цяжкі абавязак: паведамілі, што калі яны на працягу паўгода не пяройдуць з навучаннем свайго прадмета на беларускую мову, дык іх вызваляць з работы. Найхутчэй справіліся з гэтым Лея Юнгерман і Тадэвуш Врублеўскі, які шмат гадоў працаваў у беларускім асяроддзі. Найбольш цяжкасцей з пераходам на беларускую мову меў настаўнік Смерэка, памагаў я яму перакладаць на беларускую мову яго канспекты з батанікі, якія ён потым чытаў нам на ўроках.

У міжваенны перыяд у польскай сямігодцы ў Орлі з вёскі Мора вучыліся толькі я і мой сябра Кірыла Філіманюк. У беларускую дзесяцігодку далучыліся да нас яшчэ мой сусед Дзмітры Аліфярук і Уладзімір Юрчук. Хадзіў я ў аддаленую ад маёй вясковай хаты на шэсць кіламетраў арлянскую школу ў старых ботах, якія ўжо звальваліся з маіх ног. Глянуўшы на мяне, наш завуч Антон Вісаковіч сказаў: „Табе, дружа, патрэбныя абавязкова новыя боты. Ці ў тваёй вёсцы ёсць нейкая крама?" Ёсць, адказаў я. „Дык дам табе запіску з просьбай, каб прадалі табе, калі маюць, нейкія чаравікі". Пайшоў я з гэтай запіскай у нашу вясковую краму. Прысутны там вясковы актывіст Карп Паўлючук прачытаўшы запіску, якую я яму ўручыў, сцвердзіў: „Кулакам нічога не прадаем" (мой хворы бацька меў дзесяць гектараў зямлі). Сказаў я завучу Вісаковічу, што ў вясковай краме не прадалі мне ботаў. „Тады мы пойдзем у арлянскую шавецкую арцель", — вырашыў ён. У гэтай арцелі, у якой працавалі шаўцы яўрэйскага паходжання, на просьбу завуча прадалі мне чаравікі са свінячай скуры. Хадзіў я ў новых чаравіках у школу. Настаўніца Лея Юнгерман, глянуўшы на мае кароткія штанішкі, з-пад якіх выглядалі голыя лыдкі, сказала: „На дварэ мароз, а ты, дзіця, прастудзішся так слаба апрануты". На другі дзень прынесла мне ў падарку цёплыя ваўняныя падкаленныя шкарпэткі.

Дасканала запамяталіся мне некаторыя вучні пятага і шостага класаў яўрэйскай нацыянальнасці: вучань-выдатнік Лейб Ляцкі, які ахвотна дапамагаў слабейшым вучням, Шыя Вернік, дасканалы танцор, які нават у клас уваходзіў танцавальным крокам. Ніводная школьная ўрачыстасць не адбылася без беларускіх ці ўкраінскіх народных танцаў у яго дасканалым сольным выкананні. Было ў нашым класе двух блізнюкоў — Хаім і Янкель Гальперны, сыны арлянскага рабіна. Былі яны так падобныя адзін на аднаго, што не толькі настаўнікі, але і мы, вучні, не маглі іх адрозніць. Хадзілі яны ў школу ў аднолькавых касцюмчыках, кашулях і ботах і калі настаўнікі выклікалі Хаіма да дошкі, слабейшы вучань Хаім заўсёды выпіхаў да дошкі мацнейшага Янкеля.

Захоўваецца ў маёй памяці таксама прыгода, якую я меў на ўроку. Кіраўніцтва школы імкнулася прымусіць вучняў яўрэйскай нацыянальнасці да прысутнасці на ўроках у суботы. Многія вучні прыходзілі на заняткі, аднак не хацелі пісаць. Настаўнік беларускай мовы, Пётр Кароткі, спецыяльна зрабіў у суботу дыктоўку. Усе вучні ведалі, што я найлепшы ў класе па беларускай мове, таму што пісаў вершы па-беларуску і быў рэдактарам школьнай насценгазеты. Мой сябра па парце, Янкель Шумахер звярнуўся да мяне з сардэчнай просьбай, каб я напісаў яму дыктоўку. Я паспяваў напісаць тое, што дыктаваў нам настаўнік, у двух сшытках — маім і Янкеля. Калі Янкель аддаў настаўніку свой сшытак, Пётр Кароткі з недаверам запытаўся: „Ці гэта ты сапраўды напісаў?" Шумахер адказаў, што ён. Тады настаўнік выклікаў Шумахера да дошкі, загадаў узяць у руку крэйду і напісаць нейкі сказ на дошцы. Шумахер да крэйды нават не дакрануўся. І ўрэшце ён прызнаўся, што я напісаў яму дыктоўку. Настаўнік са злосцю паставіў нам абодвум двойкі. І я ледзь не заплакаў. Не захаваў я аднак крыўды ў сваім сэрцы да настаўніка. Быў жа ён маім першым настаўнікам, які падрыхтаваў мяне да пераходу ў маёй паэтычнай творчасці з польскай на беларускую мову. І калі нечакана надта хворы туберкулёзам Пётр Кароткі памёр у беластоцкай бальніцы, яго памяці я прысвяціў верш, які быў змешчаны ў школьнай насценгазеце.

Напісаў я будучы вучнем пятага і шостага класаў беларускай дзесяцігодкі ў Орлі цэлы сшытак вершаў, з якімі ўвесну 1941 года быў скіраваны на Алімпіяду дзіцячай творчасці ў Бельск-Падляшскі. Разам са мною паехалі ў Бельск Кірыла Філіманюк, мой сябра з Мора, які меў мастацкія здольнасці і намаляваў алейнымі фарбамі на палатне прыгожую карціну — лася на фоне палескага краявіду і мой дваюрадны брат Андрэй Грайка, які быў у нашай школе дасканалым дэкламатарам. На алімпіядзе выступіў ён з абшырным мастацкім творам рускага паэта Міхаіла Лермантава „Песня пра цара Івана Васільевіча...". Варта прыгадаць, што А. Грайка таксама піша вершы, з якімі выступае на беларускіх фэстах і называюць яго „паэтам Арлянскай гміны". Мне, на жаль, не дазволілі на алімпіядзе чытаць свае вершы, таму што журы не пазнаёмілася раней з іх зместам. Вершы ад мяне забралі, неўзабаве ўспыхнула вайна і яны ніколі ўжо да мяне не вярнуліся. Памяць мая захавала тры вершы з гэтага сшытка, з пачатковага перыяду маёй паэтычнай творчасці.

Памяці Пятра Кароткага

Сёння з песняю сіроцкай
Вестку нам прынёс прастор,
Што ў бальніцы беластоцкай
Пётр Кароткі ўжо памёр.

Ён гадамі маладымі
Свой жыцця закончыў век
І ніхто ўжо не падыме
І не скажа: — Чалавек,

Ты паўстань, ты падыміся,
Не пара, не памірай,
На жыццё ты азірніся,
З намі ў прышласць ты шагай.

Не, няма на свеце сілы
Каб яго к жыццю падняць,
З цёмнай вывесці магілы,
Я жыву — каб мог сказаць.

Ён не вернецца ніколі
У нашу школу, школьны двор,
Сэрцы поўняцца нам болем,
Ён памёр ужо, памёр.

Не думай ніколі, што ўмееш даволі

Сустрэць можна вучня такога,
Што амаль не ўмее нічога,
А скажа: я ўсё разумею,
Не буду вучыцца, бо ўмею.
У кнігу заглянуць не хоча,
Таму што баляць быццам вочы,
Ды хваліцца толькі навокал,
Што знае выдатна ўрокі.
Каб ведаць усё на выдатна
Патрэбна вучыць акуратна,
За кнігі з ахвотаю брацца,
У веды ўсё больш паглыбляцца.
Каб гэтага вучням дабіцца
Патрэбна вучыцца, вучыцца.
Не думай, мой дружа, ніколі,
Што ты навучыўся даволі,
Ды толькі за кнігі бярыся,
Вучыся, вучыся, вучыся.

Трактар

З клубам дыму, пылу, пары
Трактар мерае абшары.
Зямлю пора стальным носам,
Хутка верцяцца калёсы.
Трактарыст вясёлы, Федзя,
З песняю наперад едзе.
Толькі я на хвілю стану —
Уся зямелька заарана.
З клубам дыму, пылу, пары
Трактар мерае абшары.

Віктар Швед

Загадкавая бельская каплічка

Прыдарожныя крыжы і каплічкі сведчаць пра тых, што адышлі. Гісторыя ўзнікнення многіх іх найчасцей канула ў забыццё, а бывае замазваная і махлярска апісваная.

У Бельску-Падляшскім на абмежку горада, пры скрыжаванні вуліц Аградовай і Відаўскай, стаіць драўняны крыж і мураваная каплічка. Каплічка, бадай з памежжа XIX-XX стст., была збудавана з вялікім майстэрствам, хаця яе будаўнікі чэрпалі веды толькі з натуры. Векавы крыж побач, мабыць, яшчэ старэйшы за каплічку. Быў просты і высокі на 8 метраў; цяпер ён менш імпазантны, ніжэйшы, бо абрэзвалі яго, нішчанага часам, і зноў закопвалі.

Даўней крыжы ўпрыгожвалі гірлянды кветак і вянкоў з галінак, вышываныя ручнікі і іконкі. Цяпер традыцыя ўпрыгожвання крыжа і каплічкі занікла, але месца навокал іх рупліва прыбрана...

І столькі пра тое месца можа сказаць дапытлівы турыст. Распытваныя мною навакольныя жыхары з усмешкай гаварылі, што калісь у нішы каплічкі стаяла яшчэ фігура св. Яна Непамука (чэшскага заступніка вандроўнікаў), аднак забраў яе ксёндз для рэстаўрацыі і дагэтуль яна не вярнулася на сваё месца.

У гэтай мясцовай святыні, на першы погляд, не відаць праваслаўных элементаў. Яны ёсць — толькі невядома, ці сапраўдныя — у кніжачцы Тадэуша Мілера „Bielsk Podlaski jakiego nie znamy" з 1991 года. Цытую са стар. 14: „Zabytki architektury (...) 14. Kapliczka — pomnik z 1863 r. — ku czci poległych powstańców prawosławnych i katolików walczących wspólnie z caratem. Pierwotnie stała w miejscu bitwy koło Bielska, przy drodze do Pietrzykowa, później przeniesiono ją na żądanie władz carskich na skrzyżowanie ulic Widowskiej i Ogrodowej jako kapliczkę przydrożną, murowaną z figurą św. Jana Nepomucena. Stały przy niej dwa dębowe krzyże: prawosławny i katolicki".

* * *

Можа хто з чытачоў адкажа, ці напр. „prawosławni powstańcy walczyli z caratem...", а калі так, то дзе яшчэ адзін крыж — менавіта крыж праваслаўны? Можа на рэстаўрацыі? Бо згаданыя жыхары не ведалі адказу на гэтыя пытанні. Не ведаю і я, а праўда ж недзе ёсць.

Міхал Мінцэвіч

Калі ў свеце вайна

Калі ЗША разам з Вялікабрытаніяй напалі на Ірак, то нават вясковая вуліца занепакоілася, ажывілася. Дарослыя і малыя, мужчыны і жанчыны сталі палітыкаваць пад крамай, толкам не ведаючы, чаму амерыканцы бамбяць іракцаў.

Таксама нікому невядома, чаму наш польскі ўрад паслаў роту войска на дапамогу агрэсарам. Ад нас да Ірака больш за 3 000 км, прытым Ірак нічога дрэннага Польшчы не зрабіў. Наш урад проста падлізаўся ЗША, хаця амерыканцы не патрабавалі польскай дапамогі. На амерыканскія самалёты і ракеты няма ў свеце сілы. ЗША атакуюць каго захочуць. Пасля Югаславіі Пентагон разбамбіў Афганістан, цяпер Ірак, а хто будзе наступнай ахвярай амерыканскай ваеншчыны? Ірак мог не ваяваць. Садам Гусейн яўна перацаніў свае сілы і дарма запалохваў агрэсараў смерцю.

А вайны магло не быць, калі б Гусейн паслухаў голасу з Масквы. 17 сакавіка, тры дні да вайны, прэзідэнт Пуцін выслаў у Багдад свайго саветніка Яўгена Прымакова з пасланнем, у якім прапанаваў Гусейну пакінуць прэзідэнцкае крэсла і распісаць выбары. Гусейн не прыняў гэтай прапановы і рашыў даць адпор Бушу. Вядома, чым гэта закончылася. Іракская армія, не маючы сучаснай авіяцыі, не магла нічога зрабіць амерыканцам і брытанцам. Пасля 3 тыдняў вайны распаўся рэжым Гусейна.

Многім іракцам амерыканцы прынеслі вызваленне, але якім коштам! Яшчэ не палічылі колькі тысяч грамадзян Ірака загінула, колькі тысяч пакалечаных фізічна і псіхічна, колькі разбураных будынкаў. Дагэтуль не знойдзена ў Іраку зброі масавага знішчэння, аб якой увесь час гаварыў Вашынгтон. Вайна дорага абыходзіцца Амерыцы. Кажуць, што толькі адна ракета „Томагаўк" каштуе мільён долараў, а планавалі амерыканцы выстраліць 3 000 такіх ракет. Значыць, вайна каштуе мільярды долараў! За такія грошы без вайны можна купіць мноства тон нафты. Дык за што было ваяваць?

На маёй вуліцы людзі ля крамы смехам-жартам прыдумалі вершык:

Захацеў Буш ваяваць,
А Кваснеўскі памагаць
Біць іракцаў і Гусейна,
Каб папіць нафты задарма!

Мікалай Варанецкі

Каму выгадней?

Другі год абавязвае закон аб талонах на паліва для земляробаў. Кожны гаспадар, які карыстаецца трактарам, можа два разы ў год папрасіць такіх талонаў у сельскагаспадарчым банку. Адпаведныя пасведчанні выдаюць гміны.

— Усё гэта праўда, — сказаў мне аднавясковец Міхась Б. — Але што мне з паперкі, калі паліва ў Чаромсе не выдаюць, за ім трэба ехаць у Бельск-Падляшскі ці Боцькі. Гэта ж каля 50 км дарогі ў абодва бакі. Больш паліва расходую ў час падарожжа, чым яго належыцца па талоне. Працаўнік „WABa" — чаромхаўскай аўтазапраўкі паясняе:

— У мінулым годзе выдавалі, з пачаткам бягучага — адмянілі. Няма каму за талоны плаціць. Казначэйская ўстанова можа заплаціць пасля двух-чатырох месяцаў і толькі тады, як грошы будуць. Якому прадпрымальніку такая здзелка выгадна? Калі ёсць пастанова аб вяртанні, дык няхай зразу плацяць. Нам паперкі непатрэбны...

Гэта праўда. У рыначнай эканоміцы строгія прынцыпы. Хто грошы мае, той пан. У публічных фінансах хутчэй дзірку можна пабачыць, чым грошы. Таму дэпутаты намагаюцца палатаць трэшчыну пастановамі-няўдачнікамі. Да такіх можна і закон аб талонах залічыць. На маю думку заканадаўцы выгадней кропку на „і" паставіць (пры вызначэнні ўстановы, якая звяртала б грошы за талоны, дык і адпаведныя фінансавыя сродкі пасылаць), чым селяніна „за нос вадзіць" і падвяргаць лішнім клопатам. Але ў нашай дэмакратыі сыты галоднаму не спачувае. Міністрам і дэпутатам грошай хапае каб годна жыць. А што селянін канцы з канцамі не можа звесці, дык гэта выключна яго праблема.

Уладзімір Сідарук

Прыгода з банкаматам

Два тыдні таму рашыла я наведаць сваякоў, якія жывуць у Жодзіне пад Мінскам. Пайшлі мы з мужам у госці да сястры Алены, пагаварыць пра тое і сёе, пляменнікаў пабачыць. Гляджу, швагер стаў адзявацца: госці ў хату, трэба бутэльку на стол ставіць, бо госці не абы-якія, з-за мяжы прыехалі. Алена гаворыць, што грошы даюць на рабоце, але атрымаць іх не так ужо проста. Месяц таму прывезлі з-за мяжы банкамат, паставілі яго, кажуць, выгода цяпер будзе, бо той банкамат за 30 секунд выдае грошы.

Пайшлі мы паглядзець на гэты цуд і грошы атрымаць. Глядзім, а там чарга стаіць вялікая, большая як калісьці ў банку. Падышла жанчына, засунула картку ў банкамат, стала набіраць нумар, але спазнілася на пару секунд і банкамат картку з'еў і грошай не даў. Другі чалавек, што стаяў з-заду, гаворыць: „Ты не ўмееш, дай я, можа мне пашанцуе". Набраў ён нумар, кінуў картку, а банкамат напісаў: „Денег нет", і картку назад не аддаў. Абурыўся тады той чалавек і гаворыць: „Месяц рабіў, рабіў, а грошай няма, але найгоршае, што і картку не аддае, а па картку трэба ехаць аж у Мінск". Не вытрымаў і з роспачы стукнуў па тым банкамаце што было сілы. Але грошай банкамат не выдаў. Тады сябра, які стаяў каля яго, параіў ісці з ім у краму, бо яшчэ меў пару грошай на бутэльку „Сталічнай".

А мы пацягнуліся да дому смутныя, бо трэба было ісці ў банк мяняць долары і ўгашчаць швагра.

Раіса Баярунец



Фота РАФАЛА ГАЛУШЭЎСКАГА

Наймалодшы радны

Павел Мішчук, 22 гады, студэнт права і эканоміі Універсітэта ў Беластоку, выпускнік Бельскага беларускага ліцэя, у кастрычніку 2002 г. стаў радным Гарадской рады ў Бельску-Падляшскім, працуе ў камісіях інвестыцый, а таксама прасторавай гаспадаркі і развіцця горада.

— Як адчуваеш сябе малады чалавек на новай і вельмі важнай пасадзе?

— Вельмі добра. Спачатку я крыху хваляваўся, паколькі з'яўляюся наймалодшай асобай у ліку радных *(наймалодшая ў гісторыі Гарадской рады ў Бельску-Падляшскім — аўтар)*. Аднак няўпэўненасць хутка прайшла і цяпер не перашкаджае мне ў саліднай працы. А гэта патрабуе вялікай ангажаванасці, многа часу і энергіі.

— Як спалучаеш абавязкі раднага з навукай на двух факультэтах?

— Мне вельмі цяжка, аднак стараюся сумясціць абавязкі ў як найлепшы спосаб. Цяпер я на чацвёртым курсе і навукі што раз то менш, дадаткова ў мяне індывідуальны рэжым навукі, таму што я студэнт дзвюх спецыяльнасцей. Гэтае дае мне больш свабоднага часу на працу ў радзе горада.

— Якія, паводле цябе, галоўныя праблемы Бельска?

— Перш за ўсе гэта беспрацоўе і бяда. Даходы гарадскога бюджэту недастатковыя, не хапае іх на пераадоленне праблем, таму перад раднымі і бурмістрам стаіць вялікая задача: як падзяліць бюджэтныя грошы і як прыдбаць дадатковыя сродкі. Калі гаварыць пра беспрацоўе, то Гарадская рада мае невялікія магчымасці. Я думаю, што калі ў Бельску будзе больш інвестараў і інвестыцый, то гэтая праблема будзе часткова вырашацца.

— Што ты думаеш аб развіцці культур нацыянальных меншасцей у Бельску?

— Гэта вельмі важная справа, таму што шматкультурны Бельск можа вельмі многа на гэтым скарыстаць. Захаванне традыцый гэта капітал, на якім можна стварыць шмат цікавых праектаў. У Бельску-Падляшскім на культуру, у тым ліку і на нацыянальныя меншасці, адводзяцца сродкі, аднак ад некалькіх гадоў яны такія ж самыя. Нават у апошні час некаторыя прадстаўнікі правага клуба „Jedność" хацелі іх зменшыць. На шчасце да гэтага не дайшло дзякуючы супрацьдзеянню з боку клуба SLD-UP.

— Ці можа існаваць сапраўднае супрацоўніцтва паміж Польшчай і Беларуссю?

— Рашуча так! Супрацоўніцтва такое нам вельмі патрэбнае. Кантакты паміж адміністрацыяй могуць толькі дапамагчы ў супрацоўніцтве нашых фірм з фірмамі з Беларусі.

— Дзякую за размову і жадаю поспехаў!

Гутарыў Рафал Галушэўскі

Дні кар'еры ў Беластоку

Лакальны камітэт Аб'яднання студэнтаў AIESEC у Беластоку разам з газетай „Кур'ер паранны" сарганізавалі мерапрыемства пад назвай „Дні кар'еры". Імпрэза адрасаваная студэнтам сваёй мэтай ставіла дапамогу ў працаўладкаванні пасля заканчэння вучобы.

На працягу двух дзён студэнты мелі магчымасць удзельнічаць у занятках і спатканнях з прадстаўнікамі падляшскіх фірмаў, якія прапануюць працу. Можна было і асабіста пагаварыць з працаўнікамі фірмаў.

Карыстаючыся магчымасцю ўдзельніцтва ў бясплатных занятках, маладыя людзі пазнавалі спосабы прэзентацыі сваёй асобы перад працадаўцам, выбару адпаведных афертаў, пісанне заяў і біяграфій. Вялікім зацікаўленнем карысталіся заняткі хуткага чытання і курсы пад назвай „Пазнай сябе", мэтай якіх было памагчы студэнтам у адкрыцці сваіх магчымасцей і здольнасцей.

Спатканні праходзілі ва ўсіх беластоцкіх вучэльнях, а наведала іх каля 800 студэнтаў.

Паўліна Шафран

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

http://www.anekdotov.net/

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

— Купіў я дачцэ скрыпку, каб навучылася іграць, але нічога з гэтага не атрымалася.

— Таксама было і ў мяне, калі я купіў цешчы чамадан.

* * *

— Янка, што нясеш?

— Два кавуны.

— Навошта табе аж два кавуны?

— Учора цешча сказала, што аддасць палову жыцця за адзін кавун.

* * *

Зяць страшэнна пасварыўся з цешчай. Выйшаў на балкон і пытае суседа з правага боку:

— Што ты зрабіў са сваёй цешчай?

— Зарэзаў.

— А ты што зрабіў? — пытае суседа з левага боку.

— Утапіў.

— Ну! Чуеш? — звяртаецца зяць да спалоханай жанчыны. — А я цябе адпускаю на свабоду.

* * *

Зяць і цешча сядзяць насупраць сябе за сталом. Зяць думае: „Каб ты ведала, што я пра цябе думаю, дык ніколі б сюды не прыходзіла".

Цешча думае: „Калі б ты ведаў, што я пра цябе думаю, дык ніколі б не адкрыў мне дзверы ў гэтую кватэру".

* * *

— На якую дэталь звяртаеш асаблівую ўвагу, калі ўбачыш прыгажуню?

— Разглядаюся, ці паблізу няма жонкі або цешчы.

* * *

Сустракаюцца дзве цешчы:

— Ваша дачка жыве ў нас ужо два гады і яшчэ не нарадзіла дзіцяці!

— Не ведаю, што сталася; дома радзіла штогод.

* * *

— Мама, колькі гадоў спатрэбіцца, каб спаткаць хлопца, пра якога мару?

— Многа, але каб скаратаць той час можаш яшчэ тры разы выйсці замуж.

* * *

Гутараць два сябры:

— Я быў бы вельмі шчаслівы, калі б мог ашчаслівіць нейкую бедную дзяўчыну...

— А я — каб нейкую багатую мог давесці да гора.

* * *

Муж пасварыўся з жонкаю і вечарам пакінуў ёй запіску: „Абудзі мяне ў шэсць гадзін раніцы, бо спазнюся на працу". Рана абудзіўся ён, глянуў на гадзіннік, а там — дзевятая. Злосны, заўважае на століку картачку: „Уставай, ужо шостая!"

Бяссонне

Ну, вясна, хай яе халера! Урэшце прыйшла! А я сам спаць не магу. Усё праз гэтых шалёных салаўёў. А я сам адзін застаўся, без Агаты. Каб разам, дык калі б не спалі з-за гэтых спеваў у кустоўі нашага мікраёна, дык разам не спалі б. А тая мая жонка ў Каліфорніі, у сваякоў, гасцюе, а я тую еўрапейскую вясну, халодную і рамантычную сам перажываю. Ага, раматузную вясну, не такую рамантычную! Ах, ты зараза — не цёхкае, а раве-заліваецца, падчапляе шэрую самку, цешыцца ноччу, дурань, спаць не дае! Маладым хоць бы дзічкі — і так не спяць. Далучаецца да птушынага спеву і нейкі гурт з „Хаты Пухатай", студэнцкага клуба. Вокны парасчынялі, паскуды. Я, расхрыстаўшы на грудзях сваю піжаму, выйшаў урэшце на балкон. І стаю так, завешаны над начным ваяводскім горадам, і замест цешыцца, праклінаю. А каб на яго!..

Чую, у пакоі на сцяне дзвэнкнуў тэлефон. Пэўна, Збышку Наскварку не спіцца!

— Вандал, слухай, я табе песеньку з ваколіц Кадзідла заспяваю, сама ўспомніў. Ну, настаўляй вуха!

Збышка спявае ўсюды — у гарах і ў далінах, нават пад вадой. І сярод ночы яму штосьці ўспомніцца, дык, калі Тамары няма, дык можа выйсці на вуліцу і праспяваць нейкую забытую старажытную славянскую песню першаму сустрэчнаму няшчаснаму спозненаму прахожаму. А калі б прахожы быў узброены ў нож? Падумайце! І цяпер я, скрыгічучы зубамі і выкручваючы пальцы, гатоў быў Збышку ўсадзіць лязо між рэбры, каб толькі кончыў, не ўспамагаючы салаўя і ягонага калегу на яблыньцы пад блёкам. Але ж, дачакаўся, Збышка песню завяршыў і яшчэ ўскрыкнуў: „у-га!"

— Збышка, а пад тваім блёкам салаўя няма? Спаць не дае мне.

— Дык не спі. О, бачыш, як добра, што я табе пазваніў. Калі б ты спаў, ды разбудзіў бы. А так — паслухаў харошую песню. Ну, дабранач.

— На ранак збіраецца.

Я зачыніў наглуха балконныя дзверы. Душнавата. Усе вокны зачыненыя. Здохнуць можна. А і так чуваць праз старыя рассохлыя рамы, як той адурнелы ад любові салавейчык дзярэцца.

Я націснуў на галаву падушку. Ай, якая пакута! Задыхнуцца можна, хоць не чуваць салаўя. Праз пёры чую глухі позван тэлефона. Пэўна, зноў Збышка. Счакаў я крыху. А тэлефон не сунімаецца. Чую, як у кватэры пада мною пачынае бурчаць ды тупатаць старая Галка. Глухая спаць не можа! Ці з-за салаўёў, ці, можа, званкоў майго тэлефона! Хутчэй з-за яго!

— Ну, чаго?! — зароў я ў трубку. — Чаго звоніш! І так мне не спіцца, ясная халера!

— Не спіцца табе? — пачуў я голас свае жонкі, што з самай Каліфорніі да мяне дабівалася. — А чаму табе не спіцца? З кім спіш?! Хутчэй, з кім не спіш!

— Гэта, Агатка, салаўі. Каб ты тут была, таксама не спала б. Хоць мяне, беднага, прытуліла б. А так, чуеш...

І я ледзь не заплакаў у трубку.

— Не плач, Ваня, не плач. І я за табою сумую. І за салаўямі...

Усё ж, абмачыў я слязамі тэлефон, хоць гэтага не хацеў. І па пальцах уперыў мяне электраток. Салаўі!

Вандал Арлянскі

Адгаданка

Вялікі Аляксандр

(каламбур)

Хлебны напой плюс Ноўгарада святы князь-ваяр...
Царыць-любіць яго абраў усенародны наш кагал.
Раней ён ямку пад ігрыстым Лехам быў шчыра падкапаў,
А сёння — ні бэ, ні мэ, ні кукарэку — сам у яе ўпаў...

(Ш)

Разгадаць два словы з першага радка, шчыльна прытуліць іх да сябе і атрымаецца рашэнне, апісанае ў наступных радках. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 11 нумара

Яміна — манія, Судан — судна, марак — крама, яліна — ліяна, змора — мароз, круча — ручка, сапло — пасол.

Рашэнне: **Цяжка стацца справядлівым, стаўшы моцным**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

VIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць VIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы.

Тэматыка

Арганізатары не абмяжоўваюць тэматыкі дасыланых твораў. У конкурсе будуць разглядацца працы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў трох узроставых групах:

— I група: дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— II група: астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на машынцы або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас:

Redakcja „Niwy"
ul. Zamenhofa 27
15-959 Białystok 2
skr. poczt. 149

з прыпіскай на канверце: VIII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **31 ліпеня 2003 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў канцы верасня 2003 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі грашовыя і рэчавыя ўзнагароды. Дапускаюцца таксама ўсялякія іншыя ініцыятывы арганізацый і прыватных асоб з мэтай павелічэння колькасці ўзнагарод. Арганізатары будуць садзейнічаць такім ініцыятывам.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

3. Журы можа не выкарыстаць усяго фонду ўзнагарод.

4. Арганізатары прадугледжваюць магчымасць публікацыі ўзнагароджаных твораў (без права аўтараў на ганарары) на старонках „Нівы", у агульнапольскім друку і па радыё.

Заключныя заўвагі

1. Працы, якія не адпавядаюць правілам конкурсу, не будуць разглядацца.

2. У справах, якія вынікаюць з супярэчлівага тлумачэння правілаў, канчатковае рашэнне выносяць арганізатары ў паразуменні з журы.

3. Сакратарыят конкурсу змяшчаецца ў:
Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27
15-959 Białystok, tel. 743 50 22

ISSN 0546-1960